ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і Мастацтва

Год выдання 35-ы
№ 53 (2106)
1 ліпеня 1966 г.
ПЯТНІЦА
Цана 4 кап.

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР



У тым далёкім ліпені сорак чацвёртага, калі дыміліся яшчэ руіны толькі што вызваленага Мінска, ва ўсіх кутках горада на каробках дамоў, што глядзелі на свет чорнымі вочніцамі, можна было ўбачыць надпісы: «Мы адродзім цябе, беларуская сталіца!»

З тае пары прайшло 22 гады. І на берагах Свіслачы вырас новы горад, яшчэ прыгажэйшы, чым быў да вайны.

Зірні, таварыш, на гэты здымак. Палюбуйся на шматпавярховыя гмахі, на шырокія праспекты, на зеляніну паркаў і сквераў.

Мы ганарымся табою, наш Мінск, як ганарымся адроджанымі з папялішчаў гарадамі і вёскамі на Сожы, Дняпры і Нёмане, на Заходняй Дзвіне і Бугу... Усё гэта зрабілі твае рукі, савецкі чалавек, усё гэта зрабіла твая нязгасная любоў да роднай зямлі.

ПІЯНІСТЫ—ЛАЎРЭАТЫ

На Міжнародным конкурсе імя Чайкоўскага ў Маскве сталі вядомы імёны пераможцаў-піяністаў. Першая прэмія прысуджана Рыгору Санкалову (СССР), другая — Мішу Дыхтару (ЗША), трэцяя — Віктару Ярэську (СССР). Дзве чацвёртыя прэміі ўручаны Аляксандру Слабадзяніну і Георгію Сіраце (абодва — СССР). Дзве пятыя прэміі атрымалі Эдвард Ауэр і Джэймс Дзік (абодва — ЗША), дзве шостыя прэміі прысуджаны Петэру Рэзелю (ГДР) і Франсуа-Жаэлю Ціалье (Францыя). Сёмай прэміяй адзначан Андрэ дэ Гроот (Бельгія). Дзве восьмыя прэміі ўручаны Бруно Рыгуто і Алену Карнесена (абодва — Францыя). Дыплом Трэцяга Міжнароднага конкурсу імя Чайкоўскага атрымаў Іржы Глінка (ЧССР).

Акрамя таго, ганарозымі дыпломамі конкурсу адзначаны педагогі, чые вучні заваявалі тры першыя прэміі. Гэта — Л. Зеліхман і Л. Навумаў (абодва СССР), Р. Левіна (ЗША).

ПЕРАД ГАСТРОЛЯМІ КІЕЎСКАГА ТЭАТРА ІМЯ ІВАНА ФРАНКА Ў МІНСКУ

ДЗЕНЬ ДОБРЫ, УКРАІНСКІЯ СЯБРЫ!

Барыс ПЛАТОНАЎ,
народны артыст СССР

Гэта вельмі прыемна — стрэцца са старым сябрам. Такім сябрам мы, работнікі беларускага тэатральнага мастацтва, лічым Кіеўскі тэатр імя Івана Франка. Тэатр яшчэ не выступаў у Мінску, але мы добра ведаем і яго творчы шлях, і яго выдатных кіраўнікоў і акцёраў, і яго рэпертуар.

З Гнатам Юра, Мар'янам Крушальніцкім, Наталляй Ужвій мне даводзілася сустракацца асабіста. Мы разам працавалі ў Камітэце па Ленінскіх прэміях. З цеплынёй распытвалі заўсёды ўкраінскія калегі пра «сінявокую Беларусь», пра тое, як жыве наш купалаўскі... Мы ж з Тэатрам Івана Франка нездарма лічым сябе тэатрамі-пабрацімамі.

Яшчэ ў 1920 годзе ў Мінску была пастаўлена п'еса аднаго з заснавальнікаў украінскага нацыянальнага тэатра Міхаіла Старыцкага «Цыганка Аза». На купалаўскай сцэне ішлі амаль усе п'есы Аляксандра Карнейчука, многіх іншых украінскіх драматургаў. Мы не раз выступалі на Украіне, знаёмілі са сваім мастацтвам гледачоў Кіева, Харкава, Адэсы, Данецка, Жданава.

Купалаўцы старэйшага пакалення, відаць, памятаюць нашу сустрэчу з украінскім тэатрам «Берэзінь» і яго кіраўніком Лесем Курбасам. Тады мы ўпершыню прыехалі на Украіну і ўпершыню пачулі, як ласкава і пяшчотна гавораць украінцы пра нашу Беларусь: «сінявокая сястра». У нашых народаў агульны лёс, і агульны лёс у нашага мастацтва, мастацтва, якое расквітнела пад сонцам Кастрычніка.

Гэта вельмі знамянальна, што Тэатр імя Івана Франка едзе да нас пасля гастроляў у Маскве. Мы ведаем, як цёпла сустрэлі ўкраінскіх артыстаў масквічы, і самі з нецярплівасцю жадаем паглядзець і «Патэтычную санату», і «Антыгону», і іншыя прэм'еры франкаўцаў.

У Мінску вы сустрэнеце самы цёплы прыём, дарагія сябры. Калі ў беларускую сталіцу завітвае сапраўды майстэрскі калектыў—а пра ваш тэатр інакш не гавораць,—усе яе жыхары робяцца тэатраламі. Не сумняваюся, што вы заваюеце сэрцы мінчан, у іх да вас асобыя сімпатыі.

У той час, калі вы будзеце гастраліраваць у Мінску, наш тэатр будзе выступаць у Кіеве. Значыць, і ўкраінскія гледачы змогуць ацаніць здабыткі беларусаў па вялікаму рахунку. Думаю, што ад такога творчага спаборніцтва мастацтва толькі выйграе.

Трэба ўзаемныя гастролі нашых тэатраў зрабіць традыцыяй, іменна гастролі, бо сувязі і творчыя кантакты ў нас існуюць даўно, а вось такіх узаемных спаборніцтваў-аглядаў нам якраз не хапае.

Сціскаем вас у моцных абдымках, дарагія ўкраінскія сябры, і шчыра жадаем поспеху!

ПЕРШАЕ ПАСЯДЖЭННЕ

Адбылося першае пасля з'езда пасяджэнне прэзідыума праўлення Саюза пісьменнікаў БССР.

На пасяджэнні ішла гаворка аб падрыхтоўцы да правядзення 60-годдзя з пачатку літаратурнай дзейнасці народнага паэта Беларусі Якуба Коласа, 90-гадовага юбілею Цёткі (Алаізы Пашкевіч), 75-годдзя з дня нараджэння Максіма Багдановіча.

Члены прэзідыума заслухалі і абмеркавалі паведамленне старшыні Камітэта па друку пры Савеце Міністраў БССР Р. В. Канавалава аб выкананні выдавецкага плана 1966 года і аб перспектыўным плане на будучы год.

Са справаздачай аб рабоце сакратарыята выступілі сакратары праўлення Саюза пісьменнікаў БССР Янка Брыль, Іван Мележ і Пімен Панчанка.

На пасяджэнні прэзідыума ў члены Саюза пісьменнікаў Беларусі прыняты празаік Вера Палтаран і паэт Міхась Рудкоўскі.

АБМЕРКАВАННЕ СПЕКТАКЛЯЎ КОЛАСАЎЦАЎ

28 чэрвеня ў Доме мастацтваў адбылося абмеркаванне спектакляў Беларускага дзяржаўнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа, якія былі паказаны ў час гастроляў у Мінску. У абмеркаванні прынялі ўдзел драматургі, крытыкі, тэатразнаўцы, творчыя работнікі тэатра — К. Губарэвіч, Я. Рамановіч, А. Лабовіч, С. Міско, А. Саннікаў, Т. Арлова, А. Ільінскі, Г. Колас, А. Сабалеўскі, А. Герштэйн, А. Гутковіч, Ул. Няфёд, А. Шэлег.

У заключэнне выступіў намеснік міністра культуры рэспублікі Ю. Міхневіч.

ЯНЫ ПРЫНЯТЫ Ў САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ

Празаік Вера ПАЛТАРАН. Нарадзілася ў 1919 годзе ў вёсцы Бабунічы Петрыкаўскага раёна Гомельскай вобласці. Скончыла Беларускі дзяржаўны універсітэт. Працуе рэдактарам аддзела часопіса «Маладосць». Выступае ў галіне мастацкага нарыса з 1957 года.

Паэт Міхась РУДКОЎСКІ. Нарадзіўся ў 1936 годзе ў вёсцы Востраў былога Ганцавіцкага раёна. Скончыў Брэсцкі педагагічны інстытут. Працуе старшым рэдактарам Брэсцкай студыі тэлебачання. Піша з 1958 года. У 1963 годзе выдаў зборнік вершаў «Першыя вёрсты». Член КПСС.

УСПОМНІ, АДНАПАЛЧАНІН...

Кожны год аддаляе нас ад векапомных дзён вызвалення роднай Беларусі. Але жывуць і вечна будуць жыць у нашых сэрцах імёны герояў, якім абавязаны мы сённяшнім шчаслівым днём.

Прозвішча генерал-палкоўніка, Героя Савецкага Саюза Віктара Цімафеевіча Абухава добра знаёма ў нашай рэспубліцы. Вайсковыя часці пад яго камандаваннем нанеслі першыя ўдары гітлераўскай ваеннай машыне, прымалі ўдзел у абароне Мінска, Магілёва і іншых гарадоў Беларусі ў цяжкім сорак першым... А праз тры гады воіны генерала Абухава гналі немцаў з Беларусі...

Напярэдадні дваццаць другой гадавіны вызвалення Беларусі карэспандэнт «Літаратуры і мастацтва» пазваніў Віктару Цімафеевічу, які жыве цяпер у Маскве, і папрасіў яго расказаць пра самы цяжкі і самы радасны ўспамін, які застаўся ў яго з тых незабыўных дзён.

— Перажыць у вайну давялося многа, — сказаў Віктар Цімафеевіч, — было і вельмі страшнае, трагічнае — калі адступалі, было і радаснае — калі гналі немцаў з нашай зямлі. І вось гэтыя два перыяды ў мяне асабіста асацыіруюцца з адным і тым жа горадам — Мінскам.

Вайну я сустрэў камандзірам 26-й танкавай дывізіі, якая размяшчалася пад Мінскам (дарэчы, там, дзе цяпер аўтазавод). 22 чэрвеня ў пяць гадзін раніцы падняліся мы па баявой трывозе. Пад Ваўкавыскам сустрэліся з танкавымі часцямі Гудэрыяна.

Той-сёй на Захадзе піша, што немцы ў першыя дні і месяцы вайны не сустрэлі амаль ніякага супраціўлення Чырвонай Арміі. Няма патрэбы абвяргаць гэтую хлусню. Увесь свет ведае сёння пра мужных абаронцаў Брэсцкай крэпасці і іншых пагранічных гарадоў і вёсак.

І байцы нашай дывізіі з першых жа дзён вайны мужна, гераічна біліся з гітлераўцамі, адстойваючы кожную пядзю зямлі.

Памятаю, на подступах да Мінска мы знішчылі 80 варожых танкаў. Поўнасцю быў знішчаны 17-ты танкавы дывізіён Гудэрыяна.

Але сілы былі няроўныя. Ніколі не забуду, як ішлі мы праз ахутаны полымем Мінск. Сэрца сціскалася ад болю, я бачыў слёзы на вачах многіх байцоў... Тады мы пакляліся, што вернемся сюды...

Потым былі Беразіно і Магілёў. У раёне ракі Бярэзіны мы контратакавалі немцаў і адкінулі іх на 15 кіламетраў. Жорсткія баі разгарнуліся пад Магілёвам. Ішоў толькі ліпень 1941 года, а фашысты ўжо добра зведалі сілу чырвонаармейскага ўдару. Пад Магілёвам гітлераўцы страцілі каля 200 танкаў. Такіх страт у іх, мусіць, не было за ўсю вайну ў Еўропе.

Потым зноў былі цяжкія дні адступлення. Цяжка, цяжка ўсё гэта ўспамінаць. У Сталінградзе, нарэшце, Гітлеру быў нанесен такі ўдар, ад якога ён ужо не мог апомніцца. У час Сталінградскай бітвы я камандаваў трэцім гвардзейскім танкавым корпусам, якому было прысвоена імя Сталінградскага.

І мы стрымалі сваё слова — вясной 1944 года наш корпус перакінулі ў распараджэнне Трэцяга Беларускага фронту, якім камандаваў генерал арміі Чарняхоўскі. Пачалася гістарычная аперацыя па вызваленню Беларусі. Нашаму корпусу было загадана выйсці ў раёне Плешчаніц і завяршыць акружэнне фашысцкіх войск. Пра Мінскі кацёл, пра аперацыю, звязаную з вызваленнем Беларусі, многа і падрабязна напісана, і я не буду паўтарацца.

Скажу толькі, што і сёння памятаю, з якім хваляваннем уваходзіў я ў беларускую сталіцу. На вочы прасіліся слёзы, калі праходзілі мы па спаленых, зруйнаваных вуліцах горада. Але гэта былі і слёзы радасці. Вось ён, горад, дзе я пачынаў вайну, адкуль мы адыходзілі ў сорак першым...

Пасля Мінска наш корпус удзельнічаў у вызваленні Прыбалтыкі. Вайну я закончыў ва Усходняй Прусіі.

У пасляваенныя гады я часта прыязджаў у Мінск. Разам з вамі ганаруся адроджаным горадам, які стаў адным з прыгажэйшых у краіне.

Сёння, у пярэдадзень вялікага свята вызвалення, хачу перадаць сардэчнае прывітанне маім шматлікім сябрам-аднапалчанам, якія жывуць у Беларусі. Разам з імі я схіляю галаву перад памяццю тых, хто не дажыў да светлага дня Перамогі.

КВАДРАТНЫЯ МЕТРЫ ПЛЮС— ПРЫГАЖОСЦЬ!

Юрый ПАТАПАЎ,
архітэктар

У ГІСТОРЫІ нашай краіны не было яшчэ такога размаху жыллёвага будаўніцтва, як за апошнія дзесяць год. Самым распаўсюджаным пейзажам у нас стаў пейзаж з вежавым кранам.

Аднак сёння ўсё часцей і часцей можна пачуць словы незадавальнення і папрокаў за аднастайнасць і манатоннасць ансамбляў масавай забудовы, за нізкую эстэтычную якасць жылых раёнаў. І, мне здаецца, гэта вынікае з таго, што мы адзін час перасталі былі лічыць архітэктуру мастацтвам, забылі пра яе вялікае эстэтычнае ўздзеянне на чалавека. Барацьба супраць празмернасцей у будаўніцтве, з аднаго боку, нанесла і шкоду архітэктуры. Адбыўся неверагодны падзел паняццяў «архітэктура» і «будаўніцтва», хоць само слова «архітэктура» — грэчаскае і азначае — «будаўніцтва». Падзел гэты адбыўся таму, што многія лічылі, быццам будаўніцтва — гэта стварэнне матэрыяльных каштоўнасцей — будынкаў, а архітэктура нясе толькі афарменчыя функцыі і адчувальнага эканамічнага эфекту не дае, лічбамі ніякімі не пацвярджаецца, значыць, яна — «празмернасць».

І вось сумны вынік. Мы маем больш або менш дасканалыя ў канструктыўных адносінах жылыя дамы, але сумныя і непрыгожыя жылыя раёны, падобныя адзін на адзін, маем наладжаную будаўнічую вытворчасць, але амаль не маем належнага асартыменту будаўнічых матэрыялаў. У пагоні за эканамічнасцю (іншы раз недастаткова абгрунтаванай) былі пабудаваны кватэры не зусім выгодныя для жылля, і цяпер мы вымушаны перабудоўваць тэхналагічныя лініі заводаў для выпуску палепшаных дамоў. Вядома, усё гэта, як кажуць, немінучыя выдаткі вытворчасці, і тут не трэба рабіць занадта змрочныя вывады, аднак праналізаваць становішча неабходна.

Усё тое, пра што тут гаворыцца, можна было б падмацаваць прыкладамі, узятымі з многіх гарадоў нашай рэспублікі. Я спынюся толькі на горадзе Салігорску, адным з самых маладых у Беларусі. Ён будуецца па адзінаму генеральнаму плану на свабоднай тэрыторыі з добрымі прыроднымі магчымасцямі. Магутная база (будаўнічы трэст, завод жалезабетонных вырабаў) дазваляе будаваць хутка і нядорага. Узровень масавага будаўніцтва ў Салігорску, у параўнанні з іншымі гарадамі рэспублікі, дастаткова высокі і па тэмпах і па якасці. Будаўнікоў няма ў чым асабліва папракнуць.

У Салігорску існуе нават нейкая сувязь паміж будаўнікамі і праекціроўшчыкамі. Але гэтая сувязь, я сказаў бы, трошкі дзіўная. Архітэктары і будаўнікі не столькі шукаюць новыя цікавыя кампазіцыі, вырашэнні дамоў, колькі спрабуюць... выблытацца з пэўных сітуацый.

ЯК ВЯДОМА, архітэктурны праект сам па сабе не з'яўляецца канчатковым прадуктам, ён можа быць рэалізаваны толькі сродкамі будаўнічых канструкцый і матэрыялаў. І, такім чынам, амаль **усё** залежыць ад таго, якія канструкцыі і якія матэрыялы будуць у наяўнасці.

У Салігорску працуе завод жалезабетонных вырабаў. Ён выпускае будаўнічыя канструкцыі для буйнапанельных дамоў і павінен даваць за год дэталей для 30 тысяч метраў жылля. Вытворчы працэс тут наладжаны. Але вось гэтая наладжанасць вытворчасці, строгія планы, якія трэба абавязкова выконваць і якія, вядома, выконваюцца, і выклікаюць тую аднастайнасць забудовы, пра якую так многа гавораць. Кіраўнікі завода зацікаўлены выпускаць толькі пэўныя вырабы. Яны імкнуцца выконваць план па валу. І іх не турбуе, што асобныя дэталі можна было б зрабіць лепш, што можна было б зрабіць дадатковыя казыркі, панелі і іншыя элементы, якія б унеслі разнастайнасць у аблічча раёнаў. Больш таго — завод зацікаўлены ў тым, каб нічога не мяняць.

Можна было б, вядома, абвінаваціць кіраўніцтва завода ў коснасці, недальнабачнасці і іншых грахах. Аднак дзеля справядлівасці трэба сказаць, што справа не столькі ў кансерватызме дырэкцыі завода. Калі б завод меў магчымасць эксперыментаваць і быў пастаўлены ў аб'ектыўныя ўмовы, якія **прымушаюць** яго штодзённа паляпшаць сваю прадукцыю, дык ён бы да гэтага і імкнуўся. А сёння ён працуе на «вал», бо любую яго прадукцыю будаўнікі, як кажуць, ха-

(Заканчэнне на 4-й стар.).

СНОЎ-КАЛГАСНЫ ГАРАДОК

На пустачы вырасла новая вуліца.

Летам Сноў з вышыні птушынага палёту — царства зялёнага і белага колераў. Камяніцы і дрэвы. І калі вы тут пралятаеце на самалёце ўпершыню, дык першая думка — што пад вамі рабочы пасёлак, які сёння можна сустрэць у любым кутку нашай рэспублікі. І міжволі вока адразу пачынае шукаць заводскую трубу і мітусню машын каля карпусоў... Але наколькі хапае вока — поле, поле, расчэрчанае, нібы пад лінейку, на квадраты і прамавугольнікі. Вунь там, зялёная з жоўтым, даспявае азіміна, а за ёй кавалак зямлі ў цёмна-зялёных пункцірах — бульба.

І тут нехта гаворыць: пралятаем над Сновам, і адразу ўсё становіцца зразумелым — Сноў жа цэнтр вядомага на ўсю рэспубліку калгаса імя Калініна.

...З Якавам Васільевічам Аляксанкіным, старшынёй калгаса, я пазнаёміўся яшчэ ў 1954 годзе. Прыязджаў я на Нясвіжчыну з групай ільнаводаў раёна, дзе працаваў. Па вопыт. Калінінцы тады ўжо задавалі тон усёй вобласці — нідзе не атрымлівалі такіх даходаў ад ільнаводства. Памятаю, усім адразу спадабаўся старшыня. Малады, жвавы, востры на язык, ён вадзіў нас па гаспадарцы і паказваў сваё дабро. Усё тут было зроблена на рэдкасць дыхтоўна: і кароўнікі, і гумны, і сушылкі для лёну. Потым Якаў Васільевіч вывеў нас за мястэчка, паказаў рукой на вялікае поле і сказаў:

— Вось тут пабудуем калгасны гарадок з мураваных дамоў.

З гаспадароў, вядома, смяяцца непрыгожа, але той-сёй з гасцей не змог схаваць усмешкі. І калі ехалі дамоў, гаворка ішла пра апошнія словы Аляксанкіна.

— Бач ты, які спрытны, — сказаў нехта, — горад у яго будзе на голым месцы.

— А ці слова дорага каштуе, сказаў, ды й усё.

А праз некалькі год прачытаў я ў газеце, што калінінцы разгарнулі грандыёзнае будаўніцтва, што іх клопатамі і намаганнямі старажытны Сноў цяпер падзяляецца на новы і стары горад. Новы — гэта той, што ўзвялі калгаснікі.

Але, кажуць, лепш адзін раз убачыць, чым сто разоў пачуць. І вось я зноў у Снове...

У новым калгасным Доме культуры па вечарах гучыць музыка.

Калгасны гарадок. Так, гэта моцна ўражвае. Вуліца двухпавярховых мураваных дамоў, у якіх жывуць калгаснікі—былыя хутаране. Вакол акуратна заасфальтаваныя пляцоўкі. Кватэры ў гэтых дамах зусім не горшыя за гарадскія. Кожная на двух паверхах. Унізе— зала і кухня, уверсе — спальны пакой. Да паслуг гаспадыні — водаправод, газ, электрычнасць...

Ды хіба толькі гэта? Сённяшні калгасны гарадок Сноў — гэта і механізаваная хлебапякарня, сельмаг, сталовая, камбінат бытавых паслуг, бальніца, аптэка, дзіцячыя яслі, прадуктовы і кніжны магазіны.



У Снове будаўнічы кран—дэталь пейзажу.

Дарэчы, пра кніжны магазін. Бываюць дні, калі тут выстройваецца цэлая чарга. І свая бібліятэка ў доме сноўца — таксама не навіна. Нездарма ў вёску ідзе каля дзвюх тысяч экземпляраў газет, 440 — часопісаў.

Так, друкаванае слова стала надзённым хлебам сноўцаў. Як стала надзённым хлебам іх усё, што звязана з культурай. Паглядзіце на адзін са здымкаў. Двухпавярховы дом з вялікімі вокнамі, што патанае ў зеляніне. Гэта калгасны Дом культуры. Тут яшчэ пахне фарбай, адсюль толькі нядаўна пайшлі будаўнікі.

Наогул, будаўнік вельмі папулярная фігура ў калгасе. Як і ў горадзе — будаўнічы кран тут неад'емная частка пейзажу. Вось і сёння будуецца яшчэ адзін дом, у якім неўзабаве справяць навасельле 24 калгасныя сям'і.

Будаўніцтва вядзецца па плану, распрацаванаму «Белсельпраектам». У бліжэйшыя два гады яшчэ даўжэй працягнуцца вуліцы вёскі. Паабапал вуліц пралягуць бетанаваныя тратуары. І ўсюды — зеляніна, зеляніна. Сноўцы высаджваюць на сваіх вуліцах ліпы, пладовыя дрэвы, кветкі.

Сённяшні дзень Снова — заўтра кожнай беларускай вёскі. І гэта асабліва радасна ўсведамляць напярэдадні гадавіны вызвалення Беларусі ад фашысцкай навалы. На спустошанай, спаленай некалі зямлі — квітнее жыццё.

М. ЗАМСКІ.

Апетыт прыходзіць у час яды. У калгаснай сталоўцы.

ДА ДЗЁН МАНГОЛЬСКАЙ КУЛЬТУРЫ Ў БЕЛАРУСІ

Мастацтва краіны стэпаў

Э. ОЮУН,
народная артыстка МНР,
кандыдат мастацтвазнаўства

КОЖНЫ НАРОД стварае сваю непаўторную нацыянальную культуру і мастацтва, у якім раскрываецца дух народа, нацыянальныя традыцыі, асаблівы погляд на свет. Але ёсць адно агульнае, што збліжае мастацтва ўсіх народаў. Яно заключаецца ў тым, што сапраўднае мастацтва неаддзельнае ад лёсу народа, ад яго надзей і барацьбы. Цяпер, у наш век, перадавое мастацтва, якое развіваецца ў розных кутках свету, усё мацней і глыбей збліжае вялікая ідэя сацыялізма. Пацверджанне думкі аб тым, што няма сапраўднага мастацтва без жыцця народнага, можна знайсці і ў мангольскім мастацтве, якое з'яўляецца нібы аўтабіяграфіяй нашага народа.

Старажытная мангольская легенда так тлумачыць паходжанне музыкі. У мангола быў крылаты конь, дзякуючы якому яму былі адкрыты шляхі ва ўсе канцы свету. Злыя сілы загубілі каня. Каб глыбей выказаць сваё гора з прычыны беззваротнай страты, мангол зрабіў музычны інструмент (марынхур) і стварыў музыку, а потым шмат дзён і начэй аплакваў свайго любімага каня. Так народная мудрасць звязвае пачатак мастацтва з самымі патаемнымі патрэбамі чалавечай душы.

Даўным-даўно мангольскі народ праявіў свой талент у разнастайных формах мастацтва, сярод якіх па багацтву жанраў першае месца займае літаратура. Гераічны эпас, легенды, паданні, казкі, самабытная нацыянальная форма паэзіі юрол (добрыя пажаданні) і махтал (хвалебнае слова), а таксама трыяды, прымаўкі, прыказкі і інш. — вось такая каштоўная літаратурная спадчына, якая дайшла да нашых дзён і складае цяпер важную частку нашай нацыянальнай культуры. Наш народ заўсёды быў жыццялюбны, радасны, ён любіў гумар, вострае слова, смех. Гэты важны бок нацыянальнага характару знайшоў сваё яркае адлюстраванне ў вобразе Далана Худалчы — героя вясёлых апавяданняў і анекдотаў (шог уг). Далан Худалчы — сабрат па духу вясёлага героя літаратурнага фальклору народаў Усходу Ходжы Насрэддзіна. Скарбы народнага гумару заключаны ў анекдотах пра Бадарчы — дасціпнага і разумнага бадзягі-манаха.

У фальклоры выказана імкненне народа да свабоды і незалежнасці, яго гарачая любоў да радзімы, ён услаўляе прыгажосць роднай прыроды, высакародныя чалавечыя пачуцці, мірную стваральную працу. Мангольскі народ на зары сваёй гісторыі неаднаразова ўцягваўся феадальнымі ўладарамі ў несправядлівыя кровапралітныя войны, але характэрна, што ён не пакінуў аб гэтых войнах ніякага следу ў сваёй літаратурнай творчасці і нібы выкрасліў гэтыя чорныя стагоддзі з памяці. Вобраз волата (батора), які жыве ў фальклоры, сімвалізуе сабою барацьбіта за народнае шчасце, абаронцу прыгнечаных і заняволеных.

Вандроўны лад жыцця мангольцаў, адсутнасць кнігадрукавання і кнігасховішчаў мала садзейнічалі захаванню літаратурных помнікаў. Ахоўнікам літаратурнай творчасці, як і яго стваральнікам, быў народ. Да гэтага часу ў Манголіі захаваліся носьбіты эпічных формаў паэзіі — народныя паэты і песняры, так званыя хурчы. Асобныя сказіцелі не проста расказвалі, а інсцэніравалі свае расказы. Так з'явіліся такія папулярныя вадэвілі, як «Сум'я ноен», «Дунхурданам» і іншыя.

Ламаізм стагоддзямі спрабаваў заглушыць у мужнага народа раднае і светлае ўспрыняцце жыцця, падаўляючы ў ім імкненне да свабоды і творчасці, прапаведуючы пасіўнасць, сцвярджаючы, што жаданне — гэта крыніца пакут».

Але народ спяваў. У сваіх песнях ён услаўляў шырокія прасторы стэпаў, горы, дзяўчат-прыгажунь, быстрых скакуноў. Ён стварыў улігеры — казкі, дзе чынак-пастух, адолеўшы страшнага мангуса-чорта, вызваляе сваіх земляkoў, сваю каханую і атрымлівае шчасце.

У гэтых песнях (урт дуу, улігерах), казках, яролах (добрых пажаданнях) гучала надзея на светлую будучыню, на нараджэнне батораў, якія прынясуць мангольскаму народу шчасце. І вось здзейснілася спрадвечная мара: волаты прыйшлі і павялі свой народ па шляху дружбы, па шляху свабоды і стваральнай працы.

ПЕРШЫ СТРЭЛ па ворагу, які прагрымеў у лютым 1921 года каля Кяхты, зліўся з гукамі песні «Шывэ Кяхта», створанай героямі-партызанамі Сухэ-Батара. Гэта была песня пра перамогі Народна-рэвалюцыйнай арміі, пра партыю, якая прынесла народу радасць вызвалення ад спрадвечнага прыгнёту. Разам з новай дзяржавай нараджалася новая рэвалюцыйная культура. Нараджалася рэвалюцыйнае мастацтва, задачай якога стала адлюстраванне пераможнага наступу сіл сацыялізма, росквіту творчай ініцыятывы вызваленага народа, яго самаадданай працы, яго высокіх ідэалаў...

Аддаючы вялікую ўвагу развіццю народнага мастацтва, партыя і ўрад Манголіі ў 1926 годзе прынялі рашэнне сіламі і сродкамі дзяржавы пабудаваць Народны дом, да якога быў далучаны клуб імя Сухэ-Батара. Быў устаноўлены штат пастаянных артыстаў і народных музыкантаў. Народны дом стаў своеасаблівым цэнтрам прыцягнення талентаў з гушчы народа.

У далейшым хутка расце сетка розных музычных арганізацый, песенных і танцавальных гурткоў.

Пры непасрэдным удзеле першых запрошаных у Манголію савецкіх спецыялістаў у верасні 1930 года пры Народным доме былі створаны часовыя кароткатэрміновыя курсы мастацкай адукацыі. З гэтых курсаў выйшлі нашы першыя прафесіянальныя акцёры.

У лютым 1931 года, праз дзесяць год пасля перамогі Народнай рэвалюцыі, у краіне быў створаны Дзяржаўны цэнтральны тэатр. У першапачатковы перыяд на сцэне тэатра ішлі пастаноўкі, якія высмейвалі перажыткі старога быту, паказвалі перамогу новага жыцця («Наша заўтра», «Улада цемрашальства», «Прыгонны Дамдзін і княгіня Даўгор»). Ставіліся таксама пераклады з замежных п'ес.

Мангольская пастаноўка «Улада цемрашальства», прадстаўленая на Міжнароднай алімпіядзе, якая адбылася ў 1933 годзе ў Маскве, заняла другое месца.

Высокую ацэнку дала грамадскасць першай нацыянальнай оперы «Сярод маркотных гор», створанай у 1935 годзе пры актыўным удзеле таленавітага пісьменніка Дашдарджыйна Нацагдоржа.

Творчую дзейнасць Дзяржаўнага тэатра высока ацанілі партыя і ўрад, узнагародзіўшы яго ў 1936 годзе ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

У канцы 1936 года ў Манголіі было створана першае тэатральнае вучылішча. Са сцен яго выйшлі многія акцёры, якія і па сённяшні дзень з'яўляюцца гордасцю нашага тэатра.

З 1936 па 1940 год наш тэатр паставіў такія спектаклі, як «Барацьба», «Цана жыцця», «Роўна ў васемнаццаць», «Воўчая зграя», «Новы чалавек», «На рацэ Халхін-гол», «Тры шарайгольскія ханы». Ішлі таксама пераклады савецкіх і іншых зарубежных п'ес — «Бронецягнік», «Авечая крыніца», «Слуга двух паноў», «Выпадак на граніцы», «Вяселле» і г. д.

У далейшым у рэпертуар увайшлі п'есы Гогаля, Астроўскага, Чэхава, Шэкспіра, Мальера, Гальдоні, Шылера. У нас ішлі «Рускае пытанне», «Чакай мяне», «Рускія людзі», «Платон Крэчат», «На тым баку», «Голас Амерыкі», «Не называючы прозвішчаў» і іншыя спектаклі па п'есах савецкіх драматургаў. У 1955 годзе тэатр на чале з маладым, таленавітым рэжысёрам Гіндэнам паставіў «Атэла» з заслужаным артыстам МНР Г. Гамбасурэнам у ролі Атэлы і заслужанай артысткай МНР Ч. Даўгарсурэн у ролі Дэздэмоны.

Арганізаваныя па рашэнню ўрада ў 1947 годзе Лялечны тэатр і ў 1950 годзе Цэнтральны дзіцячы тэатр прыносяць сваімі спектаклямі шмат радасці юным гледачам. Спектаклі дзіцячых тэатраў «Я хачу дадому», «Залатыя зерні», «Сняжок», «Мэхэлхэ», «Барху», «Сон прадаўца», «Смешны Тогмід» і іншыя карыстаюцца вялікім поспехам у дзяцей.

На перыферыі працуюць музычна-драматычныя тэатры — ва Усходнім аймаку, у Кабдо і ў казахскім аймаку Баян-Ульгія (казахі глядзяць тут пастаноўкі на роднай мове).

З 1949 года пачалі закладвацца асновы нашага музычна-драматычнага тэатра.

Дзяржаўны тэатр і арганізаваны ў 1959 годзе Дзяржаўны сімфанічны аркестр з'яўляюцца цэнтрамі развіцця музычнага мастацтва краіны. Тут працуюць вядучыя мангольскія кампазітары. Створаны таксама аркестр нацыянальных інструментаў.

Мангольскія кампазітары стварылі шмат папулярных масавых песень. Можна назваць імёны Лубсанхурча, Дорждагва, Дугаржаба. Ім належаць песні «Аэраплан», «Багатая Манголія», «Малады караванчычык», якія былі вельмі папулярныя ў народзе.

Пяру маладых кампазітараў Дамдзінсурэна і Ганчыгсумла належаць оперы «Шлях да шчасця», «Барацьба», «Праўда». Вялікія вартасці прызнаюць крытыкі за паэмай і сюітай для сімфанічнага аркестра Ганчыгсумла. Абодва творы напісаны ў лепшых традыцыях рускай сімфанічнай музыкі і з'яўляюцца адначасова глыбока нацыянальнымі па сваёй аснове.

Цудоўныя сучасныя песні створаны маладымі кампазітарамі Мурджаржы, Дорж, Лубсаншараб.

Вялікую работу праводзяць кампазітары па збіранню народных песень і апрацоўцы лепшых з іх.

Малады танцавальны калектыў музычна-драматычнага тэатра распрацоўвае нацыянальныя мангольскія танцы, ставіць нацыянальныя балетныя спектаклі. Нашы артысты былі ўдзельнікамі міжнародных фестываляў моладзі ў Празе ў 1947 годзе і Будапешце ў 1949 годзе. У 1951 годзе на Сусветным фестывалі дэмакратычнай моладзі ў Берліне хор тэатра, артыст Жам'ян і артыстка Дашдулам заваявалі ганаровыя званні лаўрэатаў.

Саюз мангольскіх кампазітараў налічвае цяпер у сваіх радах больш ста чалавек.

Шырокае прызнанне заваявалі балеты мангольскіх кампазітараў («Ганхуяг» і «Надом ва ўдзельным княстве» лаўрэата Дзяржаўнай прэміі С. Ганчыгсумла, «Вечны касцёр» Нямбу).

Нашы кампазітары шмат папрацавалі і над музыкай да кінафільмаў. Да папулярных фільмаў «Адвергнутая дзяўчына» напісаў музыку Г. Цэрэндорж, да «Хахао хутка ажэніцца» кампазітар Бірва, да «Баясгалан» кампазітар Д. Лубсаншараб, да «Аднаго з многіх» Ц. Намсрайжаў.

Рост кадраў оперных і драматычных рэжысёраў, салістаў вакалістаў, дырыжораў, артыстаў балета даў магчымасць правесці ў 1963 годзе падзел дзяржаўнага музычна-драматычнага тэатра на тэатр оперы і балета і тэатр драмы.

Мангольскі дзяржаўны тэатр оперы і балета налічвае цяпер у сваім складзе больш 300 творчых работнікаў. У рэпертуары тэатра — оперы «Шлях да шчасця», «Барацьба» Б. Дамдзінсурэна, «Праўда» С. Ганчыгсумла, «Салавей-Намжыл» Л. Мурдоржа, балеты «Волат Ганхуяг» і «Надом ва ўдзельным княстве» С. Ганчыгсумла, «Кветка сярод бур'янаў» Чайдока. Ідуць класічныя оперы і балеты «Яўгеній Анегін», «Франэска да Рыміні», «Русалка», «Шэхерэзада», «Бахчысарайскі фантан», «Капэлія», «Чыо-Чыо-Сан».

Набраўся сілы дзяржаўны тэатр драмы. Нацыянальныя спектаклі расказваюць пра новых людзей Манголіі, пра іх працоўныя справы, пра дружбу з вялікім савецкім народам. З рускай, савецкай і зарубежнай класікі на сцэне тэатра ідуць «Атэла», «Кароль Лір», «Крамлёўскія куранты», «Вішнёвы сад», «Валыншчык са Страконіц», «Хітрыкі Скапэна». Вялікім поспехам у слухачоў карыстаюцца спектаклі па п'есах «Іркуцкая гісторыя» і «Узнятая цаліна». Тэатр папоўніўся таленавітай моладдзю з першага выпуску акцёрскага аддзялення драмы і кіно пры Дзяржаўным педагагічным інстытуце МНР.

Цікавая канцэртная дзейнасць Дзяржаўнага ансамбля песні і танца, Дзяржаўнага ваеннага ансамбля.

Вялікую работу па музычнай прапагандзе праводзіць Дзяржаўны сімфанічны аркестр. Аркестр рыхтуе лекцыі-канцэрты па класічнай, сучаснай і нацыянальнай музыцы, выязджае на фабрыкі, заводы, у сельгасаб'яднанні, дзяржгасы, школы.

ДЗЕЙНАСЦЬ творчых калектываў краіны ўсё шырыцца і расце. Работнікі тэатральнага і музычнага мастацтва Манголіі змагаюцца за стварэнне высокаідэйных мастацкіх твораў, вартых вялікай задачы, пастаўленай партыяй, — поўнай пабудовы сацыялізма ў нашай краіне.

Сучаснае мангольскае мастацтва карэннямі сваімі моцна звязана з народам. А ў савецкім мастацтве яно бачыць натхняючы прыклад служэння высокім ідэям.

Мангольскі народ міралюбны. Ідэям міру і дружбы служыць і яго мастацтва.

ФЕСТЫВАЛЬ МАНГОЛЬСКІХ ФІЛЬМАЎ

Як вядома, з 5 па 10 ліпеня гэтага года ў Беларусі праводзяцца Дні мангольскай культуры. У сувязі з гэтым у кінатэатрах рэспублікі пачаўся фестываль кінафільмаў народнай Манголіі.

З цікавасцю пазнаёмяцца беларускія гледачы з мангольскай мастацкай кінаапавесцю «Пасланец народа», створанай рэжысёрам Дэжыдыйнам Жыгжыдам па сцэнарыі Ч. Ойдава.

Гэта хвалюючае кінаапавяданне пра тое, як у 1920 годзе з рызыкаю для жыцця, праз франты і варожыя засады было дастаўлена пісьмо беднякоў Сухэ-Батару, у якім яны пісалі пра сваю гатоўнасць далучыцца да яго войскаў і ўзняць на яго сігналу паўстанне ў тыле ў белых.

Цікавы вобраз стварыла ў кінакарціне актрыса Пурэвійн Цэвэлсурэн. За гэтую работу на Маскоўскім міжнародным кінафестывалі 1959 года ёй быў прысуджаны сярэбраны медаль за лепшае выкананне жаночай ролі.

...Пасля ад'езду бацькі ў горад у сям'і пачаўся разлад. Маленькі Гачо вырашыў вярнуць бацьку. Пра тое, што давялося перажыць хлопчыку і як прымірыліся бацькі, расказвае мангольская кінакарціна «Гачо і яго бацькі». Аўтар сцэнарыя — Дажадарж Н. Надмід рэжысёр — Л. Жыгжыд.

Не без цікавасці будзе прагледжаны і мангольскі мастацкі фільм «Смак свежага ветру», створаны рэжысёрам Р. Доржпаламам па сцэнарыі Л. Вангана.

Малады бухгалтар Чойжыл павінен адпрацаваць 26 дзён на будаўніцтве. Тут ён сустракае Дэнсму, якая працуе ў адной з лепшых брыгад дзяўчат-будаўнікоў. Дэнсма захапляецца лыжным спортам, Чойжыл жа ніколі не стаяў на лыжах. Але пасля некалькіх дзён упартай трэніроўкі і Чойжыл пачынае разумець усю прыгажосць лыжнага спорту і пазнае цудоўны смак свежага ветру.

Жыццю сельскіх працаўнікоў прысвечаны мангольскія мастацкія кінакарціны «Халат не па размеру», «Ах, ужо гэтыя дзяўчаты» і «Калі б я меў каня».

З паўторнага друку на экраны рэспублікі выпускаецца савецка-мангольская мастацкая кінаапавесць «Яго завуць Сухэ-Батар».

Фільм апавядае пра гераічную барацьбу мангольскага народа за сваю свабоду і незалежнасць у 1919 годзе, калі на чале арміі абяздоленых, прыгнечаных, але няскораных манголаў сталі Сухэ-Батар і Чайбалсан.

У ролі Сухэ-Батара здымаўся папулярны савецкі кінаакцёр Леў Свердлін, у ролі Чайбалсана — мангольскі артыст Гелік Дорджы.

Убачаць гледачы таксама каляровы фільм-казку «Залатая юрта», створаны сумесна кінематаграфістамі Манголіі і ГДР.

Спектаклі нашых гасцей

ШТО ЗАНАДТА, ТО НЕ ДУЖА...

Камедыю іграць лёгка?
Камедыю іграць лёгка,
калі яе іграць дрэнна.

Аднак гумар нарадзіўся не тады, калі чалавек проста выскаліўся, а ў той час, як ён задумаўся над сутнасцю з'яў і зразумеў парадак і ўземаадносіны рэчаў.

І здзівіўся — смешнай неадпаведнасці іх і самому сабе, што не ўцяміў гэтага раней. Вось тут і з'явілася на яго вуснах вясёлая ўсмешка. Чалавек узняўся яшчэ на адну прыступку сваёй культуры і свайго развіцця.

Гумар і здзіўленне — суседзі, добрыя і даўнія. Жывуць яны і ў спектаклі Растоўскага тэатра «Апошні дзень халасцяка», які ішоў у нас прэм'ерай. Толькі добрыя суседзі на гэты раз пасварыліся.

Л. Мітрафанаў назваў сваю п'есу камедыяй-гратэскам. Чаму камедыяй—зразумела: п'еса, дзе ёсць камічныя сітуацыі і характары, многа дасціпнага, нечаканыя павароты, мае права так называцца.

З гратэскам справа горш. Але не будзем спяшацца, пройдзем разам з героямі па сюжэтных сцежках п'есы.

На міфічнай швейнай фабрыцы з міфічнай назвай «Венера» (сто дзяўчат на аднаго дэфіцытнага мужчыну) наладжваюць аўтаматычную лінію для вытворчасці ультрасучаснай «ватоўкі з дэкальтэ». Добры дзядзя — старшыня фабкома Пацалуеў (В. Волкаў) і добрая цёця — «што сядзіць на кадрах» Каралёва (Л. Цюрына) чакаюць ад нядобрых дзядзяў і цёцяў з міністэрства «ўзнагароды» — па шапцы. Каб неяк прыкрыць дэкальтэ на ватоўках і іншыя вытворчыя прарэхі, наладжваюць яны вялікую пыху: камсамольскае вяселле.

Маладых знайшлі пасля нядоўгіх, але энергічных пошукаў. Спачатку нявесту: перадавая, прынцыповая Даша (Ю. Сыч) не падышла, Паўла (Л. Сакалова) — «з характарам»—адмовілася, лірычная і мяккая Марына (Л. Арлова) згадзілася. Жаніха Сашу Закідонскага (Д. Усцінаў) купіць не ўдалося, прымусілі трохі сімпатыннага і трохі дурнаватага Ёлкіна (Э. Дземчанка) з-пад палкі.

Далей-болей. Аднак, уласна кажучы, нічога болей і не было. Патупаўшы разам з аўтарам вакол трафарэтнай блытаніны з нявестамі і сп'янелага ад першай у жыцці чаркі жаніха, усе спяшаюцца да... фіналу: нягледзячы на намаганні Пацалуева і Каралёвай пажаніць усіх — усе жэняцца самі.

Рэжысёр В. Малчанаў шмат чаго нафантазіраваў у спектаклі. І ёсць сапраўды неблагія знаходкі (вентылятар Пацалуева, напрыклад), але ў цэлым усё прыдуманае рэжысёрам жыве самастойным жыццём, мае мэту, самастойную, паралельную зместу камедыі. Ці не тут бачыў рэжысёр гратэск?

Па агульнай згодзе гратэскам дамовіліся называць гранічна завостраную форму нейкай з'явы, якая мае значную грамадскую вагу. Гратэск нібы кажа: «Стой! Далей ісці нельга! Вось тут выкладаешся ўся!» Гратэск часта балансуе на няўлоўнай мяжы паміж сатырай і трагедыяй — успомніце хаця б гратэскі Шчадрына або Сухава-Кабыліна.

Аўтар п'есы, відаць, бачыць яе гратэскнасць у неверагоднасці падзей, іх значнай умоўнасці. Але тое, што ёсць у п'есе, лёгка кладзецца ў рамкі логікі вадэвіля і не пераходзіць межы гэтага жанру.

Рэжысёр насычае спектакль так званымі «камедыйнымі атрыбутамі» — вялізным партфелем з замком адпаведных памераў у Каралёвай, малюнкам елкі на сарочцы ў Ёлкіна і г. д. — і сярод іх губляецца самая галоўная камедыйная каштоўнасць — гумар. Застаецца здзіўленне...

Пастаноўка камедыі заўсёды патрабуе ад рэжысёра і акцёраў вялікага пачуцця меры. «Занадта» — смерць для камедыі. Ад «плюсікаў», залішняй «падачы» камедыйнага паяўляецца безгустоўнасць, гумар траціць вастрыню і ў самай лёгкай камедыі робіцца шурпатым, цяжкім. На жаль, у «Апошнім дні халасцяка» амаль усе эпізоды засталіся неадшліфаванымі загатоўкамі, а калёсы камедыйнага сюжэта грувастка перавальваюцца ў штучна заданым тэмпе.

Кажуць, камедыю трэба лёгка іграць. Аднак лёгкасць гэтая зусім не залежыць ад хуткага тэмпу, што і паказаў спектакль растаўчан. Акцёры добрасумленна і старанна (залішне старанна) выконваюць усё на сцэне, гавораць амаль з кулямётнай хуткасцю, выціраюць пот, хэкаюць, а дзеянне марудна і цяжка цячэ ад карціны да карціны.

Камедыйная лёгкасць залежыць у першую чаргу ад дзвюх прычын. Аб адной — пачуцці меры — было ўжо сказана. Другая—рытм спектакля: унутраная апраўданасць дзеяння, яго напал. Можна гаварыць аб напале характараў, але характарнасць тут не выручыць.

У спектаклі растаўчан для персанажаў знойдзены характэрныя рысачкі: Пацалуеў скандзіруе словы, Ёлкін шморгае носам, Каралёва маршыруе. Але нічога не змянілася б, каб героі памяняліся рысамі. Бо рысы гэтыя не выяўляюць сутнасці характараў персанажаў, з'яўляюцца часовай прыкметай, прыдуманай для таго, каб адрозніць іх адзін ад аднаго. Затое Нектараў (А. Швейцар), камендант жаночага інтэрната, выглядае зусім іншым, калі трымае бутэльку шампанскага, як стрэльбу, і стаіць, унурыўшы галаву ў плечы, алавянымі вачыма зачапіўшыся за жаніха. Нектараў жа — былы наглядчык у турме і ўсе такія рысы ідуць ад яго характару. Таму гэтая роля ў выкананні А. Швейцара глядзіцца больш за іншыя ў стылі камедыі. Толькі акцёр занадта захапляецца дэталямі сцэнічных паводзін і іншы раз губляе цэласнасць малюнка ролі.

Камедыя скончылася, глядач пакідае тэатр. Камедыя пачынае сваё другое жыццё: яна часам становіцца эталонам для пэўных характараў. Добра, калі спектакль абудзіў пачуццё гумару, прымусіў больш пільна прыглядзецца да навакольнага.

І шкада, калі камедыя толькі пасмяшыла, пацешыла і пакінула безуважным, як недарэчна расказаны анекдот.

Урэшце, кожная камедыя, добра ці не вельмі ўдала пастаўленая, робіць сваю карысную справу. І глядач разбярэцца, што да чаго — аўтары навучыліся «падаваць» яму пэўныя думкі. Але дарагое тут яшчэ і ўзаемаразуменне двух добрых субяседнікаў, калі злёту ўхопіш думку, і твая фантазія, абуджаная спектаклем, пачынае варушыцца больш жвава.

Вялікі камедыёграф Гогаль гаварыў, што тэатр — гэта такая трыбуна, з якой можна сказаць людзям многа добрага. Бачыце, які асцярожны быў класік, сказаў «можна», падкрэсліў добры намер.

Але ад намеру да здзяйснення — дыстанцыя вялікая, і вось аб гэтым міжволі думаеш, пакідаючы залу пасля спектакля «Апошні дзень халасцяка».

Алег САННІКАЎ.



У ціхім задуменні стаяць стромкія сосны, а ля іх падножжаў густа сышліся маладзенькія елачкі... Хораша ў сасновым бары! А да яго ад Магілёўскага Дома дзіцяці, як нажуць, рукой падаць. Вось чаму ў пагодлівыя дні і спяшаецца сюды выхавацельніца Дома дзіцяці Вера Іванаўна Петушкова са сваімі маленькімі сябрамі. Яна вядзе іх у свет таямнічага, дзівоснага. Бачыце, спыніліся яны на духмянай лясной палянцы. Яна ўся ў аксаміце, у вясёлкавым пераліве кветак. І прынясуць дзеці з прагулкі часцінку адкрытай імі прыгажосці — па букеціку рамонкаў.

Фота А. УСЦІНАВА.

АБ ЧЫМ ШУМЯЦЬ БЯРОЗЫ

Аб чым гамоняць, аб чым хочуць расказаць сведкі суровых дзён вайны старыя, парэпаныя бярозы, што стаяць на скрыжаванні дарог ля музея партызанскай славы ў Расонах?

Як толькі зірне на гэтыя дрэвы дырэктар музея Міканор Іванавіч Казлоўскі, успамінае свае паходы па партызанскіх сцежках. Прыгадалася сёмага лістапада 1943 года. Адзначыць свята Вялікага Кастрычніка народныя мсціўцы вырашылі па-свойму. Падрыхтаваліся да разгрому буйнай групоўкі варожых войск, якая накіроўвалася на фронт. Бой адбыўся ў раёне вёсак Харлашы, Трыполле і Гарадавішча. Бясслаўную смерць тут знайшлі сотні фашысцкіх ваяк. Лясныя салдаты захапілі штабны аўтобус з дакументамі, зенітную гармату, радыёстанцыю, ляцы грузавікоў з боепрыпасамі. Але і для многіх партызан гэта быў апошні бой.

У музей зайшоў Пятро Фенчанка, настаўнік з Тродавіцкай школы, прывітаўся з Міканорам Іванавічам. Пайшлі ўспаміны пра баявых сяброў, гаворка пра справы музея.

Перад вайной П. Фенчанка працаваў настаўнікам у Расонскай школе. Потым узяў у рукі вінтоўку і пайшоў абараняць Радзіму. Не кожны ведаў тады, што сціплы хлопец не толькі смелы партызан, але і паэт. Пятро пісаў вершы. Нават песню склаў. У многіх атрадах гучала яна, клікала ў бой. Асобныя вершы Пятра Фенчанкі захаваліся. Нядаўна пра гэта даведаўся дырэктар музея партызанскай славы Міканор Казлоўскі. І вось невялічкія лісткі паперы з радкамі вершаў сталі экспанатамі музея.

Міканор Іванавіч у гады вайны быў вядомым партызанам на Расоншчыне. Спачатку ў брыгадзе Р. Ахоціна камандаваў батальёнам, затым узначаліў разведку. І калі год назад узнікла думка стварыць музей, арганізоўваць яго і працаваць у ім даручылі камуністу М. Казлоўскаму.

З душою ўзяўся за справу былы партызан. Баявыя сябры дапамаглі сабраць экспанаты.

Цяпер у Расонскім музеі партызанскай славы больш як 600 экспанатаў. Тут макет зямлянкі, зброя і асабістыя рэчы народных мсціўцаў... Вось пажоўклы ад часу фотаздымак. У зямлянцы над картай схіліліся камандзіры брыгады Р. Ахоціна. Тут жа, на стале, бюст Ул. І. Леніна. Тады і нарадзілася дзёрзкая думка авалодаць Расонамі. Аб гэтым гавораць скупыя радкі дакумента: «У ноч на 19 верасня 1942 года народныя мсціўцы Расонскай партызанскай брыгады нечаканай атакай вызвалілі раённы цэнтр Расоны і завяршылі тым самым выгнанне нямецка-фашысцкіх акупантаў з тэрыторыі раёна, які стаў партызанскім».

Яшчэ стэнд. На ім дэталі старога радыёпрыёмніка. Восенню 1941 года ім карысталіся ўдзельнікі камсамольскай падпольнай групы, якую ўзначальваў настаўнік Расонскай сярэдняй школы Пятро Міронавіч Машэраў. Маладыя патрыёты слухалі Маскву, запісвалі зводкі Савецкага Інфармбюро і распаўсюджвалі іх сярод насельніцтва.

Сшытак пратаколаў камсамольскіх сходаў другога атрада першай Калінінскай брыгады. Ён пажоўк ад часу. Асобныя запісы цяжка прачытаць. Гэты сшытак дваццаць гадоў захоўваў камсорг атрада, а цяпер шафёр калгаса «Расоны» Павел Маслоўскі.

Нельга не спыніцца ля «Партрэта партызанкі». Гэта адважная разведчыца Ніна Луткоўская, якую фашысты спалілі жывую. На другім партрэце — камандзір атрада імя Суворава Іван Яфрэменка. Карціны намаляваў партызан Чола Кукуладзе, цяпер заслужаны дзеяч мастацтваў Абхазскай АССР. Мастак рыхтуе ў падарунак музею вялікае палатно «Пераправа».

Баян, на якім іграў Паўка Іваноў з вёскі Паддуб'е, тэкст прысягі беларускіх партызан, нумары падпольнай газеты «Сацыялістычная праца», баявыя рапарты, фотаздымкі таго часу... Пра гэтыя рэліквіі расказвае наведвальнікам музея Міканор Іванавіч.

Расонскі музей — музей народнай славы. Тут заслужанае месца займаюць не толькі рэліквіі ваенных год, але і экспанаты, прысвечаныя пасляваеннаму жыццю роднага краю, яго цудоўным людзям.

Запісы ў кнізе водгукаў пакінулі наведвальнікі з многіх калгасаў і саўгасаў раёна, з Масквы, Мінска, Віцебска, Уладзівастока, Вялікіх Лук, Волгаграда, гарадоў Каўказа і Прыбалтыкі... Кожны запіс — падзяка краязнаўцам Расоншчыны за тое, што яны стварылі музей як памяць аб гераічным подзвігу народа.

... М. Казлоўскі і П. Фенчанка пакідалі музей позна вечарам.

— І тады, у сорак другім, калі мы наступалі на Расоны, гэтак жа сама стаялі тут дрэвы, — заўважыў Міканор Іванавіч. — Вунь з-за той бярозы я адстрэльваўся. Так што нямала і ў яе ран. Але выжыла вось...

Ішлі па вуліцы роднага горада два баявыя сябры. Над імі шумела маладое лісце бяроз.

А. БАРАНОЎСКІ,
адказны сакратар рэдакцыі расонскай раённай газеты «Камуністычны шлях».

• НЕВЯДОМЫ АРТЫКУЛ ЯНКІ КУПАЛЫ

Публіцыстычная дзейнасць народнага песняра Я. Купалы ў савецкі перыяд прыцягвае ўвагу навуковых супрацоўнікаў літаратурнага музея паэта. За апошні час былі выяўлены ў розных газетах і часопісах артыкулы і нататкі паэта, якія па розных прычынах заставаліся невядомымі. Так, нядаўна расшуканы водгук народнага паэта на смерць любімага пісьменніка моладзі М. Астроўскага. Я. Купала вельмі шчыра і цёпла пісаў пра мужнае жыццё і талент свайго рускага сабрата.

У газеце «Савецкая Беларусь» за 1923 год выяўлены артыкул «Кастусь Каліноўскі» за подпісам «К-а». Гэта — рэцэнзія на першыя паказы спектакля па п'есе «Кастусь Каліноўскі» Е. Міровіча Вядома, што доўгі час подпісам «К-а» карыстаўся Купала, але сцвярджаць, што гэта яго артыкул, было рызыкоўна. У архівах рэдакцыі супрацоўнікі музея не выявілі ніякіх дакументаў, якія пацвердзілі б аўтарства. Прыйшлося ісці іншым шляхам — вывучаць матэрыялы аб гісторыі стварэння спектакля, аб дружбе Е. Міровіча і Я. Купалы, параўноўваць стыль і мову іншых артыкулаў паэта з выяўленым. Нарэшце, было ўстаноўлена: рэцэнзія напісана Купалам.

К. ІЛЬІН.

рэплікa

ЗДЗІВІЎ!..

У трэцім нумары «Народнай асветы» за 1966 год у раздзеле «Старонка гумару і сатыры» прачытаў я невялічкі жарт настаўніка А. Бярновіча «Здзівіў». Прачытаў і... здзівіўся. Здалося мне, што нешта падобнае я ўжо чытаў. Стаў праглядаць часопіс «Костер» за 1964 год — і знайшоў тое, чаго шукаў. У адзінаццатым нумары за подпісам юнкора Колі Баранава там быў надрукаваны жарт «Удивил». Вось што пісаў юнкор:

«Мать с сыном приехали в город. Сын всматривается вверх и спотыкается.

Мать спрашивает:

— Чего в небо уставился?

— Провода... Вот видишь... Провода, — запинаясь говорит сын.

— Ну и что? — не понимает мать. — Разве ты не видел их дома, в деревне?

— Я хочу увидеть троллейбус, — говорит сын.

— Так он же только что проехал. Смотри, вон, — показывает мать.

— Нет, ты обманываешь — это не троллейбус, — говорит сын.

— Как же нет? Настоящий троллейбус, — уверяет его мать.

— А почему же тогда наша учительница Ольга Ивановна говорила, что троллейбус ходит только по проводам?»

А вось што надрукаваў у «Народнай асвеце» А. Бярновіч:

«Маці з сынам прыехалі ў горад. Крочаць па вуліцы. Сын углядаецца ўвысь, спатыкаецца. Маці пытаецца:

— Чаго глядзіш на неба?

— Чакай, мамачка, чакай!

Спыніліся. Сын па-ранейшаму паглядае ўверх.

— Ну, што ты там такое ўбачыў? Пайшлі!

— Чакай, чакай!.. Правады!... Вунь, бачыш!... Правады.

— Хіба ты не нагляджаўся на іх дома? Пайшлі!

— Чакай. Я хачу ўбачыць тралейбус.

— Дык ты на вуліцу глядзі. Вось ён якраз ідзе.

— Не мані. Гэта не тралейбус.

— Як жа не? Хіба не бачыш?

— А наша настаўніца Вольга Антонаўна казала, што тралейбус ходзіць толькі па правадах».

Як відаць, у абодвух матэрыялах вельмі ўжо шмат агульнага. Нават імя настаўніцы. Толькі бацька настаўніцы ў Колі Баранава зваўся Іванам, а ў А. Бярновіча — Антонам. Відаць, выйшла памылка пры перакладзе з рускай мовы на беларускую.

Сапраўды, здзівіў чытачоў «Народнай асветы» А. Бярновіч...

В. ТКАЧОЎ.

в. Гута
Рагачоўскага раёна.

Вожыку-25

ЮБІЛЯРУ—ПАРА ЦЁПЛЫХ СЛОЎ

Пад грукат навальніцы
Раслі твае іглiцы
І «гадзіну» калолі —
Аж войкала ад болю.
І пад спакойным небам
Не знікла ў іх патрэба,
Бо ёсць яшчэ тупіцы—
Не цямяць без іглiцы;

Бо ёсць яшчэ азадкі —
Не праймеш без шаршаткі.

Расці ж далей, калючы,
Калі смялей, балючы,
Ад скул ліхіх гаючы
«Вожык»!

Кандрат КРАПІВА.

БУДЗЕМ ВАСТРЫЦЬ ІГОЛКІ

Нехта сказаў: любы жанр добры, акрамя сумнага. А што ўжо гаварыць аб жанры сатыры і гумару? Вось і стараецца «Вожык» быць цікавым, вострым, калючым, смешным. Як яму гэта ўдаецца — цяжка сказаць. Усім не дагодзіш. Што галава, то й розум. Адзін незадаволены: мала начальства крытыкуюць, усё больш цёцю Пашу ды цёцю Дашу... Другі — наадварот: і чаго яны да начальства чапляюцца, начальству і так хапае клопату, навошта яго нерваваць, ды і карысці з гэтага мала, ну — перакінуць з аднаго наседжанага месца на другое, дык яно, начальства, і тое наседзіць... Або возьмем пытанне барацьбы з алкагалізмам. З'явіліся на старонках «Вожыка» карыкатуры на п'яніц, а тыя пратэстуюць: нас ужо, маўляў, і так у часе і прасторы абмежавалі — забягалаўкі ліквідавалі, у рэстаранах уволю гарэлкі не даюць, з дзевятнаццаці гадзін у магазінах толькі па блату адпускаюць, ды і то не распівачна, а на вынас, да прымусовага лячэння даходзім... Насуперак ім прыхільнікі «сухога закону» сваё кажуць: мала па зялёным змеі б'юць!..

Адным словам, «Вожыку» цяжка. Хапугі, бюракраты, прайдзісветы, раскрадальнікі — усе скардзяцца, усе незадаволены. Папы, праўда, ды іншыя да іх ладобныя маўчаць, бо ім паводле евангелля даравацъ трэба ворагам сваім, але і яны, я ўпэўнены, у цішы сваіх кабінетаў... прабачце, гэта я пра бюракратаў думаў, — у цішы сваіх алтароў — анафемствуюць.

А ёсць у нас і такія героі, што і не крыўдзяцца, не злуюцца, а толькі пасмейваюцца. Вось узяць хоць бы графаманаў. Колькі карыкатур на іх давалі, колькі эпіграм! А яны — смяюцца ды пішуць, бо тых карыкатур ды эпіграм на свой рахунак не прымаюць.

Але гэта, відаць, адзіная катэгорыя вожыкаўскіх герояў, што не злуюцца і не крыўдзяцца. Усе іншыя — крыўдуюць. Нават міліцыя. Памятаеце малюнак: міліцыянер збіраецца ў паход на самагоншчыкаў і... у кабуру цыбуліну кладзе — на ўсякі выпадак. Вось і крыўда. Не характэрна, кажуць. Але ж бывае? Бывае.

«Так такі ўжо ўсе і крыўдзяцца? — запытаюцца ў мяне. — Так усе і незадаволены?» Вядома, не ўсе. Сумленныя людзі, ведама ж, не крыўдуюць. Яны — смяюцца. І доказ таму — стотысячны тыраж часопіса. А пачынаў «Вожык» з дзесяці тысяч. З дзесяці да ста—вялікая дыстанцыя. Вялікая дыстанцыя і ад таго плаката «Раздавім фашысцкую гадзіну», што выдаваўся ў час Вялікай Айчыннай вайны і з якога, уласна, і вырас «Вожык», да таго часопіса, які мы маем цяпер. Я не кажу аб ідэях і мэтах. Ідэі і мэты засталіся ранейшыя: барацьба з тым, што перашкаджае нам на шляху да пабудовы камунізма. Я маю на ўвазе культуру выдання, круг аўтараў—літаратараў і мастакоў, разнастайнасць матэрыялаў, іх мастацкую якасць і многае іншае, што кідаецца і не кідаецца ў вочы.

«Вожык» — гэта не толькі часопіс з эмблемай вожыка са стылом на вокладцы. «Вожык» — гэта і бібліятэчка сатыры і гумару з гадавым тыражом больш за сто тысяч экземпляраў, і перыядычныя плакаты ў дапамогу насценным газетам, і альбомы карыкатур, і зборнікі сатырычных твораў, якія без яго клопатаў, магчыма, і не ўбачылі б свету; «Вожык» — гэта і канферэнцыі чытачоў, семінары пачынаючых аўтараў, выстаўкі карыкатур; «Вожык» — выступае па радыё, прасочваецца ў праграмы тэлебачання; «Вожык» — гэта не толькі рэдакцыйны калектыў з дванаццаці чалавек, і не толькі рэдкалегія яго, і не толькі паўтара дзесятка мастакоў, што супрацоўнічаюць у часопісе, — гэта вялікая армія нашых чытачоў і адначасова карэспандэнтаў, якія сігналізуюць нам з усіх куткоў нашай рэспублікі, ледзьве толькі ўбачаць ці адчуюць нешта ненармальнае, злачыннае, недарэчнае.

І мінулае «Вожыка» і будучае — у моцнай сувязі з жыццём, са сваім чытачом, у вырашэнні надзённых праблем нашага часу.

Я ўжо казаў, што паўтара дзесятка мастакоў (нават з гакам) супрацоўнічаюць у «Вожыку». Мастакі трох пакаленняў: старэйшага — А. Волкаў, М. Гурло, М. Жытніцкі, С. Раманаў, В. Ціхановіч; сярэдняга — Я. Ганкін, Р. Грамыка, В. Ждан, З. Паўлоўскі, А. Чуркін, В. Шваццоў; малодшага— Я. Бусел, А. Жыхарэвіч, Л. Чурко, В. Шматаў. І кожны з іх са сваім пэндзлем, са сваёй манерай, са сваёй тэматыкай.

У Савецкім Саюзе выдаецца багата часопісаў гумару і сатыры. «Вожык» непадобны ні на аднаго з іх. «Вожык» — гэта «Вожык», менавіта — беларускі часопіс сатыры і гумару. І не толькі мова альбо арнамент робяць яго непадобным, скажам, да малдаўскага «Кіпэруша» ці да татарскага «Чаяна», ці да ўкраінскага «Перца». І наш сельскі пейзаж, і нашы гарады з усёй іх архітэктурнай эклектыкай, і аблічча вожыкаўскіх персанажаў, і праблемы, якія вырашаюцца на яго старонках, і нашы дасціпныя, народныя жарты, прымаўкі, прыказкі — усё надае «Вожыку» арыгінальнасць.

На старонках часопіса друкуюцца апавяданні, вершы, байкі, гумарэскі, фельетоны. Кола аўтараў шырокае, хаця пажадана, каб яно было яшчэ больш шырокім. Побач з вядомымі нашымі паэтамі К. Крапівой, М. Танкам, П. Панчанкам, П. Броўкам, М. Лужаніным, К. Кірэенкам, А. Астрэйкам, А. Зарыцкім і празаікамі Я. Брылем, М. Паслядовічам, Р. Сабаленкам працуюць маладзейшыя: Р. Барадулін, Н. Гілевіч, Ул. Нядзведскі, А. Лойка, Б. Сачанка, Я. Каршукоў, Л. Арабей, а таксама зусім маладыя — Я. Верабей, Ул. Отчык, М. Вяршынін, Р. Яўсееў, Р. Падневіч, З. Шостак, І. Сяркоў, Зм. Бяспалы, браты Бароўкі — настаўнікі, студэнты, рабочыя, інжынеры... Цяжка пералічыць усіх маладых аўтараў, якія друкуюцца на старонках «Вожыка».

Свой пасільны ўклад у справу развіцця сатыры і гумару ўносяць і пісьменнікі, што працуюць у рэдакцыі часопіса: Я. Герцовіч, М. Гроднеў, В. Зуб, П. Кавалёў, Г. Кляўко, Ул. Корбан, М. Пянкрат, Я. Сіпакоў.

Першыя свае кніжкі выдалі ў бібліятэчцы «Вожыка» В. Быкаў, А. Дзялендзік, І. Аношкін, В. Шымук, Ц. Карага, М. Гарнак, С. Пацёмкін, В. Маеўскі, І. Падбярэжскі.

За дваццаць пяць гадоў існавання часопіса колькі маладых аўтараў надрукавалі свае першыя творы ў «Вожыку», атрымалі, так сказаць, «пуцёўку ў літаратурнае жыццё»! І колькі іх ідзе — маладых, таленавітых, поўных сіл.

Планы на будучае?

«Вожыку» не хапае «плошчы», каб змяшчаць усё тое, што варта даць чытачу, каб знаёміць яго з сатырычнымі творамі братніх рэспублік і краін народнай дэмакратыі. Чаму б нашаму часопісу не выходзіць на шаснаццаці старонках, як выходзіць, напрыклад, латышскі часопіс сатыры і гумару «Дадзіс»? Ды і бібліятэчку «Вожыка» пара б ужо выдаваць не з шасці кніжак на год, а з дванаццаці. За дзесяць гадоў яна даказала, што мае права не толькі на існаванне, але і на пашырэнне.

Звычайна, калі гавораць пра юбіляраў, адзначаюць толькі станоўчае. Мы ж добра ведаем, што ёсць у нас і грахі, і агрэхі. І хоць «Вожыку» яшчэ толькі 25 гадоў, мы не адносім гэтага на кошт хваробы росту.

Мы будзем працаваць.

Сяргей ДЗЯРГАЙ,
рэдактар аддзела літаратуры часопіса «Вожык».

Ну, хто болей на падарунак нашаму дарагому Івану Іванавічу!..

Малюнак В. ШМАТАВА.
З юбілейнага нумара «Вожыка».

АДНА З 58-мі

Нядаўна ў «Бібліятэцы «Вожыка» выйшла кніжачка апавяданняў і гумарэсак Барыса Сачанкі «Вол-фігурыст». Да гэтага часу мы ведалі Барыса Сачанку галоўным чынам як навеліста. Цяпер з'явіламагчымасць пазнаёміцца з яго сатырычнымі і гумарыстычнымі творамі.

Хочацца сказаць, што ў нялёгкім жанры смеху Сачанка сказаў сваё ёмкае слова — часам гарэзлівае, часам іранічнае, часам здзеклівае. Возьмем яго апавяданне «Адным словам». Напісана яно ў форме ўнутранага маналогу... прабачце, ледзь не сказаў чалавека. Справа ў тым, што героя апавядання ніхто ні разу ў жыцці і не назваў чалавекам. Як толькі з'явіўся на свет, яго назвалі «нованароджаны», пайшоў у школу — пачалі зваць «вучнем»— першакласнікам, другакласнікам, трэцякласнікам... Далей — студэнт, аспірант, дацэнт. Халасцяк, муж, бацька... У поездзе ён быў проста «пасажырам», у магазіне— «пакупнікам», у бальніцы — «хворым», у арміі — «салдатам»... З мяккім дасціпным гумарам Сачанка стварае вобраз, над якім не столькі хочацца пасмяяцца, колькі задумацца. І не смешнае, а хутчэй іранічнае заканчэнне апавядання:

«Цешу сябе надзеяй, што адзін раз чалавекам мяне ўсё ж назавуць. Гэта будзе тады, калі памру і мяне будуць везці на могілкі. Нехта спагадліва, спадзяюся, не стрывае і скажа:

— Адным словам, жыў чалавек і няма чалавека...»

У лепшых гумарыстычных творах Сачанка ўдала пазбягае прамой, ці, як кажуць, лабавой маралі, павучальнасці. Хаця павучальнасць у іх ёсць. Яна вынікае непасрэдна са зместу. Сядзяць, скажам, на лавачцы ў скверы два неразлучныя дружбакі—настаўнік Язэп Антонавіч і бухгалтар Антон Язэпавіч, бавяць час у размове. Паўз іх па тратуары людзі праходзяць, некаторыя чапляюцца за цвік, што выткнуўся з дошкі, — хто падае, хто адрывае падэшву... А яны разважаюць:

— Вось, скажы ты, людзі! Сто чалавек пройдзе, сто зачэпіцца, а каб узяць камень ды цвік забіць— нікому і ў галаву не цюкне.

Бачаць дружбакі, што каза ў сквер лезе праз дзірку ў агароджы — зноў абураюцца: ну і людзі, прыбіць шалёўчыну ніхто не здагадаецца... Пачынае накрапваць дождж, і яны самі хутчэй лезуць праз тую ж дзірку ў плоце, каб напрасцяк да хаты падацца... Як бачым, аголеная мараль ў творы няма, і яна ёсць—баявая, едкая, калючая. Яна ў характарах гэтых двух абывацеляў, балбатуноў, якія любяць пабурчэць на іншых, а самі і палец аб палец не стукнуць дзеля агульнай, грамадскай карысці.

Б. Сачанка ўмее смяяцца. Усмешка ў яго не яркая, а памяркоўная, разважлівая, можна сказаць, глыбінная, гумарыстычны элемент якой схаваны часцей за ўсё не ў незвычайнай, дасціпнай фразе, а ў самой жыццёвай сітуацыі.

Гаворачы пра гумар Б. Сачанкі, трэба зазначыць, што ён цалкам ідзе ад народнага. Невыпадкова ён уключыў у зборнік нізку народных апавяданняў «Трохі смеху з падранага меху». Той-сёй можа папракнуць аўтара, што ён запісаў ужо вядомыя народныя ўсмешкі, але наўрад ці папракне хто Сачанку за тое, што запісаны яны нецікава.

З цікавасцю чытаюцца кароткія байкі ў прозе (пад рубрыкай «Неверагодна, але факт») і афарызмы. Дарэчы, адна з баек і дала назву зборніку.

Нарэшце, надышоў час сказаць і традыцыйнае «але». Многія гумарэскі і апавяданні расцягнуты, ім не хапае вастрыні. Вельмі наіўным выглядае апавяданне «Помста»— не зусім удалы пераказ не дужа смешнай сітуацыі са студэнцкага жыцця. Не верыцца ў хуткае перавыхаванне і гераіні другога апавядання — цыганкі-варажбіткі, хаця Б. Сачанка і стараецца настроіць чытача на такое перавыхаванне.

«Вол-фігурыст» — 58-я кніжка «Бібліятэкі «Вожыка». 58 кніжак— гэта сапраўды цэлая бібліятэка беларускага гумару і сатыры. Вялікімі тыражамі пайшлі гэтыя кніжкі да чытача, несучы ў іх і едкую сатыру і добрую ўсмешку. Хочацца спадзявацца, што і апошняя з іх — кніжка Б. Сачанкі— таксама прыйдзецца па душы шматлікаму чытачу.

Сымон БЛАТУН.

КАБ ЗАЎСЁДЫ НЕБА БЫЛО ЧЫСТАЕ

У БАКУ ад дарог, ля яра, стаіць вялікі мармуровы абеліск. На ім — словы: «Тут пахаваны тысячы расстраляных і закатаваных ахвяр фашысцкай акупацыі. Радзімамаці вечна будзе памятаць герояў, якія аддалі сваё жыццё за шчасце і мір на зямлі».

Сюды, пакланіцца светлай памяці герояў, прыйшлі прадстаўнікі камсамольскіх арганізацый прадпрыемстваў, будоўляў, навучальных устаноў. Так пачаўся ў Віцебску Дзень баявых традыцый.

На святочна ўпрыгожаных аўтобусах моладзь накіравалася да месцаў вечнай славы, дзе юныя ленінцы неслі ганаровую варту.

Першы прыпынак — ля помніка, узведзенага ў памяць аб подзвігу 145-й Віцебскай стралковай дывізіі. Адсюль савецкія воіны 22 гады назад пачалі вызваленне горада. Сярод іх быў і Уладзімір Міхайлавіч Парункевіч. Хвалюючыся, усё перажываючы нанава, расказвае ён пра сваіх баявых таварышаў, якія паўтарылі тут, ля безыменнай вышыні, подзвіг панфілаўцаў.

Маладыя віцябляне пабывалі ля дома, дзе, вызваляючы горад, капітан Мясаедаў першы ўзняў чырвоны сцяг; на Успенскай гары, дзе ў засені дрэў патанаюць у кветках магілы легендарнага бацькі Міная і дзесяці іншых воінаў і палкаводцаў.

Незабыўнае ўражанне пакінула наведанне былой турмы гестапа. Ля ўваходу ў падвал, дзе фашысцкія забойцы закатавалі Веру Харужую, былая вязень гэтай турмы і лагера смерці ў Асвенціме Ганна Іванаўна Лапаіна і віцебская падпольшчыца, ганаровы грамадзянін горада, Герой Сацыялістычнай Працы Марыя Ільінічна Мацэнка звярнуліся да моладзі з кароткімі, гарачымі прамовамі.

Памяці загінуўшых будзьце вартыя!— да гэтага заклікаюць моладзь людзі, якія прыйшлі з легенды, гэтага патрабуюць вільготныя сцены падвалаў, якія і сёння захоўваюць сляды незвычайнай стойкасці і непахіснасці савецкіх патрыётаў.

— Будзем вартыя! — ад імя ўсіх юнакоў і дзяўчат Віцебска адказалі камсамольскія важакі Усевалад Красянкоў, Мікалай Плотнікаў, маладая работніца Ала Мудрусенка, дэлегат XV з'езда ВЛКСМ Валерый Мяркулаў і іншыя.

А ў нядзелю, 26 чэрвеня, на святкаванне Дня савецкай моладзі і 22-й гадавіны вызвалення Віцебска ў парку Мазурына сабраліся тысячы людзей рознага ўзросту. Перад імі выступілі ганаровы грамадзянін горада, Герой Савецкага Саюза Ф. Блахін, былы сакратар падпольнай камсамольскай арганізацыі «Юныя мсціўцы», Герой Савецкага Саюза Е. Зянькова, Героі Савецкага Саюза А. Трухаў, І. Собалеў. Разам з усімі удзельнікамі свята яны радаваліся яснаму блакітнаму небу, спявалі вясёлыя камсамольскія песні, слухалі выступленне народнага ансамбля «Маладосць» і лепшых удзельнікаў мастацкай самадзейнасці горада.

Свята было не толькі ля цэнтральнай эстрады. У кожным кутку вялікага парку было цікава і весела. Дасціпныя вершы, напісаныя на вялікіх палотнішчах, заклікалі ў гандлёвыя рады. На танцавальных верандах грымела музыка, кружыліся пары. Масавікі прыдумвалі вясёлыя гульні. Аматары спорту разам з заслужанымі майстрамі выпрабоўвалі свае сілы, спрыт, удзельнічалі ў розыгрышы кубка па валейболу.

Велізарнай святочнай пляцоўкай стала Заходняя Дзвіна і яе берагі. Тут і заплывы спартсменаў, і гонкі на скутэрах і шлюпках, і масавае катанне на лодках, і выстаўка марскіх і авіяцыйных мадэляў.

Увечары ў гарадскіх парках імя Ул. І. Леніна і М. В. Фрунзе, на вуліцах і плошчах працягваліся маладзёжныя балі, канцэрты, масавыя гулянні. Свята закончылася вялікім прыгожым феерверкам.

Я. ПАЛУШКІНА.
Фота Л. МАКАРЭВІЧА.

ПАПАЎНЕННЕ

Попыт на кваліфікаваныя музычныя кадры ў нашай рэспубліцы з кожным годам узрастае. У Беларусі штогод адкрываюцца новыя музычныя школы і пашыраюцца кантынгенты навучэнцаў ва ўжо існуючых школах і вучылішчах. Яны павінны мець дастатковую колькасць педагогаў-музыкантаў. Велізарная армія ўдзельнікаў самадзейнага мастацтва ўвесь час адчувае вялікі недахоп у кваліфікаваных кіраўніках хораў і аркестраў, у баяністах-акампаніятарах. Ды і нашы прафесіянальныя музычныя калектывы чакаюць прытоку новых выканаўчых сіл. Таму невыпадкова ў кожным чарговым выпуску Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі і абласных музычных вучылішчаў так зацікаўлена наша грамадскасць.

Гэтымі днямі ў Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі адбыўся ўрачысты акт з выпадку яе дваццаць шостага выпуску. Новы атрад маладых музыкантаў папоўніць рады мастацкай інтэлігенцыі рэспублікі. Сярод тых, хто толькі што скончыў кансерваторыю, ёсць кампазітары і музыказнаўцы, піяністы, скрыпачы і вакалісты, хормайстры і выканаўцы на духавых і народных інструментах. Усяго — 92 чалавекі.

Урачыстасці адкрыў рэктар кансерваторыі, заслужаны дзеяч мастацтваў БССР Ул. Алоўнікаў. Ён павіншаваў выпускнікоў з паспяховым заканчэннем кансерваторыі і ўступленнем на шырокую дарогу самастойнага творчага жыцця. З цёплымі словамі звярнуліся да дыпламантаў старшыня Дзяржаўнай выпускной камісіі, прафесар Ленінградскай кансерваторыі, доктар мастацтвазнаўства А. Дзмітрыеў, педагогі нашай кансерваторыі — прафесар М. Аладаў і Л. Мухарынская, намеснік міністра культуры БССР Р. Мачулін. Ад імя выпускнікоў Л. Дворжац, М. Даўгалёў, А. Астром сардэчна падзякавалі выкладчыкам кансерваторыі за атрыманыя веды і навыкі ў галіне музычна-педагагічнай і выканаўчай дзейнасці.

У сёлетнім выпуску (маецца на ўвазе ў першую чаргу дзённае аддзяленне) нямала здольных музыкантаў. Чатыры выпускнікі атрымалі дыпломы выдатнікаў. Гэта музыказнаўца Л. Касцюкавец, якая пакінута працаваць у кансерваторыі ў якасці асістэнта на кафедры кампазіцыі і музыказнаўства, піяністы А. Рашацян, накіраваная ў сярэднюю спецыяльную музычную школу, і завочніца, выкладчык Мінскага музычнага вучылішча Л. Ліхалетава, нарэшце, піяністка Л. Дворжац, якая бліскуча скончыла кансерваторыю і цяпер рэкамендавана ў аспірантуру.

Апошнія два гады ў Беларусі зусім не было выпускаў па класу кампазіцыі. І вось, нарэшце, сёлета наша кансерваторыя дала пуцёўку ў жыццё траім маладым кампазітарам — А. Зайцаву, Я. Касалапаву і Ф. Пыталёву. Кожны з іх, апрача індывідуальнай творчасці, павінен будзе займацца выкладчыцкай працай, весці тэарэтычныя дысцыпліны ў Маладзечанскім, Віцебскім і Брэсцкім музычных вучылішчах, куды яны атрымалі прызначэнні. У абласных музычных вучылішчах маецца на ўвазе хутка стварыць на тэарэтычных аддзяленнях класы па кампазіцыі з ліку найбольш здольных да гэтага віду творчасці навучэнцаў. І дапамога маладых кампазітараў тут асабліва патрэбная.

Яшчэ адзін выпуск Белдзяржкансерваторыі. А на змену тым, хто пакінуў сцены роднай кузні музычных кадраў, прыйдзе новая таленавітая моладзь з музычных вучылішчаў і сярэдняй спецыяльнай музычнай школы г. Мінска, якую сёлета скончылі 45 юных музыкантаў.

Г. СІЦЯК.

НАШ някруглы СТОЛ

пародыі-эпіграмы-усмешкі

Сёння «Наш някруглы стол» прысвечаны юбіляру — часопісу «Вожык». Уласна кажучы, не самому «Вожыку», а пісьменнікам і паэтам, якія працуюць альбо супрацоўнічаюць у часопісе. За «Нашым някруглым сталом» адбыўся імправізаваны літаратурны вечар, на якім вожыкаўцы і яго актыўныя аўтары выступілі з чытаннем сваіх твораў. На вечары прысутнічаў наш нештатны карэспандэнт Георгій Юрчанка, які паспрабаваў застэнаграфаваць некаторыя выступленні. Вось што ў яго атрымалася.

ПАПАЎСЯ

Павел КАВАЛЁЎ.

Падзеі развіваліся такім парадкам. Участковы ўпаўнаважаны Архіп Жалезабетонны да самага світанку не спаў. Прычынай была не бяссонніца, а, наадварот, паведамленне першакласнікаў Стасіка Пільнага і Ясіка Уважлівага аб тым, што яны бачылі, ідучы са школы.

А бачылі яны вось што. Каля хмызнячку, што па левы бок ад дарогі, пасвіліся авечкі. Некалькі з іх зайшло ў крайнія кусцікі. І раптам увесь статак кінуўся ад хмызнячку ў поле. Напалохаць іх, безумоўна, мог толькі шпіён, які, напэўна, хацеў злавіць авечку, зарэзаць і засмажыць.

Усю ноч Жалезабетонны строіў планы, як злавіць шпіёна.

Ужо зусім развідняла. Вось-вось пакажацца сонца. Дзесяткі планаў вярцеліся ў разгарачанай Архіпавай галаве.

Раптам пачуўся нясмелы стук у дзверы. Архіп, як сядзеў, у споднім кашулі, портках, босы, пайшоў у сенцы і адкінуў кручок. Крокі за тры ад дзвярэй стаяў змарнелы, абраслы шчэццю чалавек, трымаючы рукі ўгору і спалохана, запалымі вачыма гледзячы на Жалезабетоннага.

— Я... я... ш-ш-піён, — дрыжачым голасам прагаварыў незнаёмы. — Я зразумеў, што мне ад вас не ўцячы, калі ўбачыў, што праз цэлую ноч у вашай хаце свеціцца акно...

АПОВЕСЦЬ ПРА ЎЛАСНЫ ПОМНІК

Аляксей ЗАРЫЦКІ

Настроіў ліру я і заспяваць гатоў
Пра бабкі, маслякі, апенькі,
гаварушкі.
Ды ўспомніў раптам:
мне ж не да грыбоў, —
Да сябра-скульптара спяшаюся
узрушаны.

Прыбег, гляджу. Дапраўды, гэта—я.
І рыхтачкі пабраў,—а божа ж любы.
Фігура ўся мая!
І выпраўка мая,
Чупрына, рот, і нос, і нават губы.

Я поглядам да мармуру прынік,
У захапленні аглядаючы скульптуру.
Тры метры шырыні,
Пяць метраў вышыні!
Вось гэта дык размах,
Вось гэта дык фактура!

А скульптар між скульптур
паходжвае, як бог,
Снуе задумы план, каго і як
змайстачыць.
Дык дзякуй, дружа, ты мне дапамог
У натуральны рост сябе самога
ўбачыць.

ЯК Я КАХАЎ

Міхась ПЯНКРАТ

Было гэта вясной. Было не калі-небудзь, а гады два таму назад, калі я канчаў чацвёрты клас. За першаю партай сядзела яна — кволенькая трысцінка па імені... Але хіба важна імя? Усё і так ясна. Светлыя колцы валасоў каля ружовых вушак, а калі абарочвалася — цёмная сінява ледзь прыплюшчаных і крышачку сумных вачэй. Гэта па ёй уздыхаў я пад посвіст салаўёў і кумканне жаб, па ёй трымцелі напятыя струны ў сэрцы маім, і песня ірвалася хвалюючая, клікала ў даль нязведаную, пуцявінай вяла няпройдзенай.

Забрала яна маё сэрца. А сваё аддаць... Эх, ды што там! Хіба ж не людзі вы, не разумееце? Іду я, чалавекаадзінка, са сваім аднабокім каханнем і нібыта мне свет завязаў хто, полагам квяцістым завесіў. Хвалююся, а ў грудзях то холадна, то наадварот. Думкі блукаюць далёкадалёка і ўсё астатняе. Дзе буйная кіпень майго юнацтва?

Адшумела яно тапалінае.

Адцвіло калінай надрэчнаю.

Ясенем разгалістым адшаптала.

Адзвінела жаўранкамі.

Адышло!

Не будзе заўтра і паслязаўтра. Лёс мой шчарбаты, шчасце з трашчынкаю босым пайшло кудысьці па калючых верасах міма плакучай івы-вярбіны. Луг — без канца-краю і песня — прывабная, хвалюючая, кліча, спяшаецца. Трымцяць у душы якісь струны, сумуюць аб нечым далёкім і няясным.

Было гэта два гады таму назад.

Два гады!..

ЧАТЫРОХКУТНІК

Валянцін ЗУБ

Аднойчы да нас у рэдакцыю завітала невысокая чарнявая дзяўчына і светла ўсміхнулася, бліснуўшы моцнымі здаровымі зубамі. Яе ўсмешка азарыла рэдакцыю нейкім лагодным святлом.

— Дзе мне ўбачыць таварыша Клыка?—неяк хораша спыталася яна і пяшчотна паглядзела ў мой бок.

— Я Клык,—няёмка падняўся я з-за парэпанага і досыць такі замурзанага стала.

— У мяне да вас справа. Такая справа, што не ведаю, з чаго пачаць,—шчабятала яна, адначасова ўсаджваючыся на стул і ашчупваючы маю таўставатую фігуру прыемным позіркам.—Завуць мяне Надзеяй Клычок,—стрэльнула яна ў мяне чорнымі, як вугольчыкі, вачыма, з якіх так і сыпаліся іскрынкі весялосці.—А справа ў мяне, ой, толькі не перабівайце. Я чытала аднойчы ваша апавяданне і таму лічу, што толькі вы мне зможаце дапамагчы. Я працую ў «Светлым шляху» трактарысткай. У мяне закахаліся Саўка-матарыст і Дзям'ян-бульдазерыст. Абодва прыгожыя, сталыя. А я як перадавая трактарыстка рашыла выйсці замуж за таго, хто сур'ёзней ставіцца да грамадскай працы. Штомесячныя паказчыкі выпрацоўкі ў іх звычайна аднолькавыя. Таму я не ведаю, каму аддаць перавагу. Дапаможыце мне. Дапаможаце, так?

— Безумоўна, безумоўна, я прыеду, пацікаўлюся,—гаварыў я, не ў сілах адвесці вачэй ад яе, можа, крышачку больш чым трэба дэкальтаванай кофтачкі і загарэлага трохвугольніка на грудзях.

— Вось дзякую. Я ў вас не памылілася. А можна мне,— яна на момант запнулася,—называць вас... цябе... на ты?

— К-к--ка-калі л-л-лас-ка,— зусім разгубіўся я, не разумеючы, у чым справа.

Назаўтра я быў у «Светлым шляху». Спыніўся, вядома, у Надзеі. Але пазнаёміцца ні з матарыстам, ні тым больш з бульдазерыстам не паспеў. Праз дзень я вярнуўся ў Мінск. Не адзін. З цяжкасцю я цягнуў ладна напакаваны куфэрак, а побач весела шчабятала Надзейка.

Так, вы, напэўна, здагадаліся,—мая жонка.

Чатырохкутнік неспадзявана замкнуўся і ператварыўся ў дзве перакрыжаваныя прамыя.

ВЫНАХОДНІК

Уладзімір КОРБАН

БАЙКА

Сусед мой Цішка Байкароў
(Хай будзе ён здароў)
Займаўся вынаходніцтвам сем год.
Праседжваў ночы навылёт:
Глядзіш, то кола зробіць,
то стырно,
І вынайшаў,—ды не,
не зоркалёт,—
Верацяно!
І я часамі так раблю:
З гармат па вераб'ях палю!

28 чэрвеня, у гадавіну смерці народнага паэта Беларусі Янкі Купалы, на яго магілу прыйшлі беларускія пісьменнікі. Яны прыйшлі, каб ушанаваць памяць песняра, ускласці вянкі і кветкі. На здымку: вянок ускладаюць Іван Мележ і Янка Брыль.

Фота Ул. КРУКА.

ХОЦЬ СУВЕНІРЫ МЕЛІ ПОСПЕХ...

Сёлета ў канцы мая ў Беларускім пастаянным прадстаўніцтве ў Маскве быў наладжаны паказ мастацкіх сувеніраў, якія выпускаюцца прадпрыемствамі БССР. Трэцяя частка іх адабрана для продажу на Сусветнай выстаўцы ў Канадзе. Сярод сувеніраў ёсць створаныя і прафесіяналамі, і народнымі майстрамі.

Высокую ацэнку ў Маскве атрымалі сувеніры са шкла і фарфору. Флягі для нацыянальных напіткаў, зробленыя ў фарфоры Л. Багданавым і В. Леантовічам, ухвалены за зграбнасць формы, цікавае кампазіцыйнае і колернае вырашэнне. Арыгінальна выкарыстаны матэрыял і раскрыта спецыфічная асаблівасць вытворчасці ў шкляным прыборы для каньяка «Дзежачка» (мастак Г. Ісаевіч), бакалах «Зубр» (мастак А. Абрамава), у наборы кілішкаў «Барыні» (мастак Ул. Мурахвер). З творчай выдумкай зроблены мастаком Л. Мягковай прыбор для віна «Сямейка» і сувенірныя талерачкі — мастаком С. Раудвеэ. Памянёныя работы вызначаюцца нацыянальным каларытам.

На паказе сувеніраў у Маскве ўсе сышліся на думцы, што работы мастацкага калектыву Міністэрства прамысловасці будаўнічых матэрыялаў вылучаюцца прафесіянальным майстэрствам, вобразнасцю.

Станоўча ацэнена таксама работа мастакоў Віцебскага дывановага камбіната. Малады мастак Ул. Федаровіч паказаў цікавыя сувенірныя дыванчыкі. У вырабах Аршанскага ільнокамбіната цудоўна спалучаюцца лён з лаўсанам у парцьерах, ручніках, абрусах. Шкада толькі, што вельмі нізкая па якасці ўпакоўка. Упершыню паказаў свае вырабы Мастацкі фонд БССР. Карысталіся поспехам керамічныя сувеніры мастака І. Сакалінскай «Першы хлапец на вёсцы», «Ганна на шыі», «Школьнікі» і іншыя.

Многа розных узораў сувеніраў паказала Міністэрства мясцовай прамысловасці БССР.

Вырабы, што адабраны на Сусветную выстаўку, выстаўлены цяпер у Лужніках.

Такія вынікі паказу сувеніраў у Маскве сведчаць пра пэўны прагрэс у развіцці беларускага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

І ўсё ж, думаецца, мы не маем права заспакойвацца. Мы пакуль яшчэ выпускаем вельмі многа сувеніраў на нізкім мастацкім і тэхналагічным узроўні.

Якія ж прычыны гэтага?

Прамысловым прадпрыемствам, якія выпускаюць мастацкую прадукцыю, прапануецца план выпуску сувеніраў. Для выканання плана неабходны перш-наперш мастакі — стваральнікі гэтых сувеніраў. Ад творчых здольнасцей мастакоў залежыць вынік. Не паглыбляючыся ў дэталі, адзначым, што такіх людзей на прадпрыемствах сёння вельмі мала. Многія кіраўнікі прадпрыемстваў і работнікі міністэрстваў недастаткова актыўна запрашаюць мастакоў працаваць на вытворчасці, абмяжоўваючыся эпізадычнымі заказамі на стварэнне ўзораў сувеніраў мастакам «збоку». А якраз жа непасрэдная сувязь мастака з вытворчасцю і дае яму магчымасць глыбока зразумець асаблівасць тэхналогіі. Зразумець для таго, каб выявіць яе вартасці ў рэчах, якія ён, мастак, стварае. Каб у мастацкай рэчы гарманіравалі яе вобразная аснова, матэрыял і прыёмы апрацоўкі. У нас жа мастакі недастаткова глыбока вывучаюць тэхналогію. Мы мала клапоцімся пра гэта. І таму адзін з асноўных недахопаў нашых сувеніраў, які кідаецца ў вочы пры першым жа праглядзе, — няведанне іх стваральнікамі спецыфікі вытворчасці. Так, напрыклад, у сувенірах са скуры не адчуваецца матэрыял, яны перанасычаны арнаментальнымі тэкстыльнымі матывамі, натуралістычнымі малюнкамі. Вырабы з дрэва часта нагадваюць метал, іх дэкор таксама натуралістычны, з распрацоўкай перспектывы, што парушае плоскасць вырабу. Такія самыя элементарныя недахопы. Яны сведчаць пра неразуменне некаторымі аўтарамі і кіраўнікамі прадпрыемстваў спецыфічных заканамернасцей прыкладнога і дэкаратыўнага мастацтва. І вось падобныя тавары пад рубрыкай «Мастацкі сувенір» мы не толькі пускаем у шырокі продаж, але і асмельваемся прапанаваць на Сусветную выстаўку!

Асобныя кіраўнікі прадпрыемстваў і работнікі міністэрстваў не прымаюць пад увагу рашэнні мастацкіх саветаў. Напрыклад, сувеніры, якія выпускаюцца фірмай дзіцячых цацак Міністэрства лёгкай прамысловасці БССР, былі прагледжаны прэзідыумам Саюза мастакоў рэспублікі. Большасць з іх былі забракаваны як антымастацкія. Нягледзячы на гэта, прадпрыемства, на чале якога стаіць тав. І. Навадворац, выставіла сувеніры для адбору ў Маскву. Камісія, у склад якой уваходзілі мастакі, мастацтвазнаўцы, гандлёвыя работнікі, інжынеры, у другі раз пацвердзіла антымастацкасць прадукцыі. Тым не менш Міністэрства лёгкай прамысловасці пасылае вырабы ў Маскву, дзе яны былі канчаткова адхілены як антымастацкія. Але... яны па-ранейшаму выпускаюцца ў нашай рэспубліцы.

У такіх умовах «валявога» кіраўніцтва і магчымы выпадкі, калі робіцца сувенір «Домік Першага з'езда» са здымным дахам для... скідванняў недакуркаў! А колькі мы яшчэ робім натуралістычных пенчукоў з сякерамі, віл, кос, лапцей і іншай этнаграфічнай безгустоўшчыны.

Мне здаецца, наспеў час, каб на чале прадпрыемстваў, што выпускаюць мастацкую прадукцыю, сталі людзі, якія маюць пэўную мастацкую адукацыю, эстэтычны густ.

А цяпер два словы пра тое, як часам мы няўмела карыстаемся тэхнікай, як яна «забівае» ў няўмелых руках тую ідэю, якую ўклаў у свой твор мастак. Асабліва гэта датычыць прадпрыемстваў з высокім узроўнем тэхналогіі вытворчасці. Масавая прадукцыя, якую яны выпускаюць, мае вельмі нізкую якасць. Гэта таму, што ручная праца няўдала рацыяналізуецца. Малюнак, напрыклад, пачынаюць наносіць штампам, друкам, дэколлю, што, безумоўна, дае магчымасць павялічыць вытворчасць сувеніраў, але ад гэтага мастацкая якасць шмат у чым траціцца. А іншы раз тэхнікі проста нестае. Так, на больш дробных прадпрыемствах, асабліва ў мясцовай прамысловасці, мала добрага абсталявання. Івянецкая керамічная фабрыка, якая працягвае нацыянальныя традыцыі ганчарнага мастацтва, працуе, па сутнасці, на старым прамысловым абсталяванні, дрэнна забяспечваецца сыравінай і матэрыяламі, і гэта, безумоўна, не спрыяе якасці прадукцыі.

Нельга не сказаць тут і пра недахопы ў распаўсюджванні сувеніраў.

Белгалантарэяй Міністэрства гандлю БССР створана база і аддзел сувеніраў. Гэтая арганізацыя ў сваёй рабоце сутыкаецца з шэрагам цяжкасцей. Па-першае, і па сёння не вырашана пытанне своечасовага зацвярджэння цэн на сувеніры. У выніку нават цікавыя сувеніры пралежваюць на паліцах пакояў узораў і ў музеях прадпрыемстваў. Па-другое, сувеніры пастаўляюцца ў сістэму гандлю без спецыяльнай арыгінальнай упакоўкі. І таму ў магазінах прапануюць пакупніку каштоўны сувенір загорнутым у газету.

Сувеніры дрэнна рэкламуюцца. Паасобныя каталогі сувеніраў вельмі нізкай паліграфічнай якасці. Яўна недастатковая колькасць латкоў, якія гандлююць сувенірамі, як у Мінску, так і ў абласных цэнтрах.

Як бачым, многае, вельмі многае замінае нам ствараць высокамастацкія сувеніры. Трэба неадкладна выпраўляць недахопы ў гэтай галіне мастацкай вытворчасці, каб паспяхова выступаць і на ўсесаюзнай, і на міжнароднай арэне.

В. ГАЎРЫЛАЎ,
старшыня секцыі прыкладнога і дэкаратыўнага мастацтва Саюза мастакоў БССР.

МУЗЫЧНАЕ ЖЫЦЦЁ

НАРОДНАЯ ШКОЛА

Тры гады назад калектыў выкладчыкаў Брэсцкай музычнай школы прыняў рашэнне: на грамадскіх асновах праводзіць музычна-адукацыйную работу сярод перадавікоў вытворчасці. Так пачала сваё жыццё народная музычная школа — першая ў нашай рэспубліцы. Вучэбны план быў разлічаны на тры гады, на працягу якіх вучні павінны былі авалодаць асновамі музычнай культуры і тэхнікі ігры на інструментах.

Пачаліся заняткі па класах фартэпіяна, баяна, акардэона, скрыпкі, домры, гітары. Акрамя спецыяльных дысцыплін, абавязковымі сталі сальфеджыо, музычная літаратура, наведванне харавога класа. Выкладалі лепшыя, галоўным чынам маладыя настаўнікі Л. Глебка, В. Палюга, А. Дарахаў, Ж. Байкова, Э. Лапаціна, А. Селівонава і іншыя.

Непрыкметна міналі гады. І вось — першы выпуск. Сярод тых, хто скончыў народную музычную школу,— токар рамонтна-механічнага завода М. Бондар, які атрымаў пасведчанне з выдатнымі адзнакамі, нікеліроўшчык М. Сімянтовіч, тэлеграфістка Т. Грыгор'ева, выдатнік міліцыі С. Смаль. Большасць з іх яшчэ ў час вучобы сталі актыўнымі ўдзельнікамі, а некаторыя і кіраўнікамі мастацкай самадзейнасці на сваіх прадпрыемствах і ва ўстановах.

Сёлета ў народную музычную школу будзе прынята 30 перадавікоў вытворчасці.

Т. ГАЛІЦКАЯ,
выкладчыца Брэсцкай народнай музычнай школы.

МАРШРУТЫ БРЫГАД

12 канцэртаў на тэму «Шляхі развіцця савецкай музыкі» дала ў Бабруйскім раёне канцэртна-лекцыйная брыгада Беларускай дзяржаўнай філармоніі. Перад гледачамі выступалі лектар Л. Бедрына, цымбаліст М. Шмелькін, салісты В. Чэньяш, Л. Шубіна, В. Ручыца, акампаніятар Ул. Нікалаеў. Яны паказалі канцэрты ў Асіповічах, Кіраўску, у вёсках Каменка, Глуша, Лапічы, Ліпень і інш.

Другая брыгада філармоніі пабывала ў Брэсцкай вобласці. З цікавасцю слухалі брэстаўчане выступленне лектара Л. Аўэрбаха, салістаў Г. Агніўцавай, Т. Ігошыну, А. Валошына, якія выконвалі нумары пад акампанемент Е. Эфрон.

Цяпер у Гомельскай вобласці знаходзіцца трэцяя група артыстаў філармоніі. Яны выступаюць пераважна перад слухачамі універсітэтаў культуры з канцэртамі «Шляхі развіцця савецкай музыкі» і «Беларуская музычная культура». У складзе гэтай брыгады — — лектар І. Зубрыч, цымбаліст А. Астрамецкі, салісты Д. Зубрыч, Т. Пастуніна, А. Купрыянава, Я. Цвятаева і акампаніятар А. Стэрлін.

НА ЗЯЛЁНЫХ ЭСТРАДАХ

На цэнтральнай сядзібе саўгаса «Віцебскі» сабраліся рабочыя. Тут выступае Дзяржаўны народны аркестр БССР пад кіраўніцтвам маладога дырыжора Юрыя Яфімава.

Такія канцэрты на зялёных эстрадах адбываюцца шмат дзе. Народны аркестр выступаў у Полацку, Віцебску, Бешанковічах. У бліжэйшы час ён выедзе з канцэртамі ў Магілёўскую вобласць, а таксама будзе гастраліраваць па калгасах Міншчыны.

Разам з аркестрам выступаюць салісты філармоніі Валянціна Папова і Сяргей Машкоў.

Другі калектыў—Дзяржаўны сімфанічны аркестр—выязджае на гастролі ў Брэст, Гродна, Віцебск, Магілёў, Гомель. Летні канцэртны сезон абяцае быць цікавым.

На здымку вы бачыце выступленне народнага аркестра на цэнтральнай сядзібе саўгаса «Віцебскі».

Фота і тэкст М. РУБІНШТЭЙНА.

ЧАРОЎНАЯ ПАЛАЧКА

Знікла зала, дзе вы знаходзіцеся. Вас падхапіла велізарная хваля і панесла далёка, далёка. Вы ў бушуючым акіяне гукаў. Гэта грыміць, лютуе «Багатырская сімфонія» Барадзіна...

Але ўявім на імгненне, што мы не слухаем канцэрт, а бачым выканаўцаў і дырыжора за пультам. Вось ён узмахнуў дырыжорскай палачкай... Угледзьцеся ў яго вочы. Яны ўвесь час размаўляюць з выканаўцамі. Загадваюць. Просяць. Радуюцца. Злуюцца. Падбадзёрваюць. Супакойваюць. Патрабуюць. Воля дырыжора становіцца воляй усіх сямідзесяці выканаўцаў.

Хто ж ён, гэты чараўнік? Міхаіл Міхалаевіч Салдатаў — дырэктар Магілёўскага музычнага вучылішча. Будынак гэтага вучылішча на Ленінскай вуліцы вядомы сёння кожнаму магілёўчаніну. Вядомы тым, што з вокнаў льюцца гукі фартэпіяна і скрыпак, валторн і флейт. Дом гэты зусім нядаўна падарылі будаўнікі.

Можна шмат чаго добрага сказаць пра вучылішча, яго выкладчыкаў і вучняў. Пра тое, што яго выхаванцы першыя сярод абітурыентаў кансерваторый. Пра тое, што з усёй Беларусі і нават Прыбалтыкі едуць сюды на семінары, па вопыт. Што ў гэтых поспехах вучылішча немалая заслуга яго дырэктара — камуніста М. М. Салдатава.

Але мне хочацца расказаць аб тым, як шырока расчыніліся дзверы канцэртнай залы вучылішча для ўсіх. Расказаць пра выдатны сімфанічны аркестр, якім кіруе Салдатаў. У гэтым калектыве, як кажуць, цвет музычнага Магілёва. Вядомыя канцэртмайстры, скрыпачы Соф'я Салдатава і Іосіф Гелер, віяланчэліст Уладзімір Лапідус, выдатныя выканаўцы Сяргей Куляшоў, Якаў Хігер, Валянціна Урына, Зяма Міхалевіч, Уладзімір Панулін, Кацярына Атрошчанка. Тут не толькі прафесіянальныя музыканты. Ёсць і матэматыкі... Аркестр жа добраахвотны, аматарскі. І званне яму прысвоена—народны. А выканаўчае майстэрства высокае, сапраўды прафесіянальнае. Дзякуючы Салдатаву і яго сябрам, тысячы людзей пабагацелі душой. У іх свет увайшлі Моцарт і Чайкоўскі, Шастаковіч і Хачатуран... Нездарма аркестру апладзіравалі на шматлікіх канцэртах, на гастролях у Мінску і Брэсце. Нездарма Міхаілу Міхалаевічу сёлета прысвоена ганаровае званне заслужанага дзеяча культуры Беларусі.

Я. РЭЗНІКАЎ.

СПРАВАЗДАЧНЫ КАНЦЭРТ АСПІРАНТА

ЦІКАВЫ канцэрт адбыўся ў Маладзечанскім музычным вучылішчы 28 чэрвеня. У госці да выкладчыкаў і вучняў прыбыў аспірант Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі цымбаліст Аляксандр Ляончык. У зале прысутнічалі рэктар кансерваторыі заслужаны дзеяч мастацтваў БССР Ул. Алоўнікаў, член мастацкага савета кансерваторыі дацэнт В. Роўда, кіраўнік А. Ляончыка ў аспірантуры прафесар, народны артыст БССР І. Жыновіч.

Аляксандр Ляончык — першы аспірант-цымбаліст, выхаванец нашай кансерваторыі. Яго выступленне яшчэ раз паказала, якія неабмежаваныя магчымасці ў цымбалаў, прыцягнула ўвагу да надзённых пытанняў развіцця беларускай цымбальнай музычнай культуры.

У суправаджэнні Серафімы Бялькевіч канцэртант выканаў вялікую і разнастайную праграму, прадэманстраваўшы высокую культуру гуку, гнуткую і выразную кантылену, багатую тэхніку.

У рэпертуары А. Ляончыка творы, напісаныя спецыяльна для цымбалаў, і пералажэнні. Выканаўца «падкрэсліў» асноўныя вартасці інструмента. Яго тэхніка была ясная і выразная, а кантылена настолькі зітаваная, што слухач часам зусім не адчуваў трэмаліруючага характару стварэння гукаў, што вынікае з самой прыроды цымбалаў. Выкананнем «Рускай песні» Стравінскага і «Лязгінкі» Хачатурана А. Ляончык паказаў вялікія магчымасці цымбалаў у перадачы твораў розных стыляў і нацыянальных афарбовак. Свежае гучанне фіналу Скрыпічнага канцэрта Кабалеўскага, Чацвёртага «Славянскага танца» Дворжака, фантазіі Сарасатэ на тэмы «Кармэн» Бізэ пацвердзіла бязмежныя магчымасці цымбалаў у выкананні класічных твораў. Аднак найлепш гучалі ў канцэрце творы, напісаныя спецыяльна для гэтага інструмента (Канцэрт Камінскага, Канцэрціна Глебава) і асабліва — «Беларускія танцы» І. Жыновіча.

На абмеркаванні, якое адбылося пасля канцэрта, выступленне атрымала высокую ацэнку.

Канцэрт сведчыць, што ў Беларускай кансерваторыі надаецца сур'ёзнае значэнне развіццю традыцый цымбальнай музычнай культуры. На жаль, у падрыхтоўцы цымбалістаў ёсць нямала цяжкасцей і нявырашаных праблем. Мала ў нас выкладчыкаў, у многіх дзіцячых музычных школах няма цымбальных класаў, не стала масавай «цымбальная» самадзейнасць. У рэспубліцы мала выпускаецца цымбалаў і перш за ўсё высакаякасных канцэртных інструментаў. Прафесіянальных выканаўцаў-цымбалістаў у нас адзінкі, іх творчасць мала прапагандуецца, асабліва па радыё і тэлебачанні. Невялікі і рэпертуар для цымбалаў, мала твораў, напісаных для іх спецыяльна. Цымбальная музычная культура, якая ўжо заваявала шырокае прызнанне савецкай і зарубежнай грамадскасці, павінна стаць сапраўды масавай, гэта, у сваю чаргу, створыць умовы для выяўлення новых таленавітых выканаўцаў.

Л. ШКОЛЬНІКАЎ,
дырэктар Маладзечанскага музычнага вучылішча.

Філарманічны каляндар

ЛІПЕНЬ

Беларуская дзяржаўная філармонія пашырыла сваю «глядзельную плошчу». Цяпер акрамя філарманічнай залы мы маем вялізную залу Палаца спорту. Тут будуць наладжвацца канцэрты, якія могуць сабраць куды больш гледачоў. 1 і 2 ліпеня ў Палацы спорту адбудуцца выступленні артыстаў югаслаўскай эстрады, дакладней, артыстаў горада Загрэба. У канцэрце прымуць удзел Здэнка Вучковіч, Бісерка Спевец, Ніно Робіч, Лідзія Кодрыч, Габі Новак, Тоні Леснавар, вакальнае трыо «Рэха» і эстрадны ансамбль пад кіраўніцтвам Дражэна Боіча.

5, 6 і 7 ліпеня ў Палацы спорту будуць выступаць госці з Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі. Мы пачуем аркестр пад кіраўніцтвам Ала Кола, салістаў Рыку Дэус і Інго Графа. У Мінску да іх упершыню далучаецца Зігфрыд Валендзі. Далейшую паездку па СССР зоркі нямецкай эстрады будуць рабіць разам з ім.

З 26 па 31 ліпеня ў Палацы будуць праходзіць вялікія канцэрты пад дэвізам «Мелодыі сяброў». У іх прымуць удзел лепшыя выканаўцы СССР і іншых сацыялістычных краін. На жаль, не ўдакладнены спіс удзельнікаў гала-паказаў, але што гэта будзе адна з цікавейшых падзей летняга канцэртнага сезона, не выклікае сумнення.

Цяпер пра канцэрты ў самой філармоніі.

2 ліпеня заслужаная артыстка РСФСР Марыя Міронава і Уладзімір Менакер «вернуць» мінчанам канцэрт, які не адбыўся ў сувязі з хваробай выканаўцаў у час гастроляў па Беларусі ў мінулым месяцы.

5 ліпеня ў філармоніі ўрачысты вечар, прысвечаны 45-й гадавіне Народнай рэвалюцыі ў Манголіі і адкрыццю Дзён мангольскай культуры ў БССР.

Вечар замежнай паэзіі з удзелам вядомага чытальніка заслужанага артыста РСФСР Вячаслава Сомава адбудзецца 6 ліпеня.

У наступны дзень канцэрт даюць маленькія артысты—лаўрэаты Трэцяга рэспубліканскага агляду мастацкай самадзейнасці школьнікаў.

8 і 9 ліпеня з Палаца спорту ў канцэртную залу перамесцяцца канцэрты артыстаў эстрады ГДР пад кіраўніцтвам Ала Кола.

Зоркі нямецкай эстрады Рыка Дэус (злева) і Інго Граф.

«С. Міхалкоў. Аб сумным і смешным» — з такой праграмай прыязджае да нас дыпламант Усесаюзнага конкурсу чытальнікаў Юрый Андрэеў. Яго выступленне адбудзецца 10 ліпеня.

Наступныя тры дні нашымі гасцямі будуць артысты эстрады Харкава. Яны прывязуць паказ «Вас выклікае Харкаў». У канцэртах прымуць удзел жаночы эстрадны аркестр «Харкаўчанка» (кіраўнік заслужаны артыст УССР А. Літвінаў), лаўрэат Рэспубліканскага конкурсу Л. Шатаў (фельетоны) і спевакі М. Гамальянава і Ул. Страцьеў.

Пяць дзён, з 15 па 19 ліпеня, у Мінску будзе выступаць Рыжскі эстрадны аркестр.

20 ліпеня ў нас урачысты сход, прысвечаны 22-й гадавіне Польскай Народнай Рэспублікі і 1000-годдзю Польскай дзяржавы.

З 22 па 24 ліпеня ў філармоніі дае канцэрты спявак Іван Тараканаў, а 30 ліпеня пачынаюцца канцэрты артыстаў эстрады Кіева з удзелам А. Ганчарова. Украінскія госці будуць выступаць да 2 жніўня.

А. КАРДЫМОН,
дырэктар-распараджальнік канцэртнай залы філармоніі.

Кутох калекцыянера

БАТАНІЧНЫ САД—ЮБІЛЯР

Сухумскаму Батанічнаму саду—125 год. Тут вядуцца вялікія работы па акліматызацыі і укараненню ў сельскую гаспадарку Грузіі і яе аўтаномнай рэспублікі Абхазіі каштоўных субтрапічных культур. Іменна ў Сухумскім Батанічным садзе былі ўпершыню высаджаны чайныя кусты, апельсінавыя і лімонныя дрэвы, масліны і каштоўныя злакі, якія так узбагацілі за апошнія паўстагоддзя мясцовую флору. Калектыў спецыялістаў гэтай старэйшай у Абхазіі навуковай установы ўдзельнічаў у складанні такіх каштоўных прац, як чатырохтомнік «Флора Абхазіі», «Флора дрэў і кустоў субтропікаў заходняй Грузіі», манаграфій па асобных культурах. Трэба дадаць, што Сухумскі Батанічны сад—пастаянны ўдзельнік Выстаўкі дасягненняў народнай гаспадаркі СССР, дзе яму неаднаразова прысуджаліся ганаровыя дыпломы.

У азнаменаванне юбілею Батанічнага саду Міністэрства сувязі СССР толькі што выпусціла серыю з трох паштовых марак. На адной з іх—наміналам у тры капейкі—адлюстраваны ружовы лотас, які прыжыўся ў Сухумі дзякуючы намаганням навуковых супрацоўнікаў саду. Марка выканана ў спалучэнні зялёнага, ружовага і аранжавага колераў.

На шасцікапеечнай марцы — характэрны для Абхазіі раслінны свет—пальмы, кіпарысы. Пераважныя колеры—палевы, зялёны, блакітны, карычневы.

У гаме блакітных, зялёных і ружовых адценняў выканана дванаццацікапеечная марка з адлюстраваннем здзіўляючай па прыгажосці вадзяной расліны «Вікторыя круцыяна».

Аўтары малюнкаў — мастакі Надзежда Строганава і Міхаіл Аляксееў. Друк—глыбокі. Зубцоўка—рамачная. Памеры жывапіснага поля—23,5 на 35,5 міліметра.

Марыя КАВАЛЁВА.
(АДН).

КВАДРАТНЫЯ МЕТРЫ ПЛЮС— ПРЫГАЖОСЦЬ!

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

паюць яшчэ цёпленькай, каб выканаць план уводу жылля.

Пра якую ж якасць і пра якую дасканаласць можа ісці гаворка ў такой гарачцы! А калі яшчэ дадаць, што завод да гэтага часу працаваў на зношаным, старым абсталяванні і выпускаў старую серыю дамоў, якая ўжо нідзе не выпускаецца, дык карціна стане яшчэ больш непрывабнай. Вось і выходзіць, што кожны год у Салігорску мы будуем аднолькавыя дамы, з невыгоднай планіроўкаю кватэр, ды яшчэ і дрэнна зробленыя. Кожны год Салігорск атрымлівае 10—12 дамоў-блізнят, якія можна адрозніць толькі па розных заганах ды па канфігурацыі аблезлых фасадаў.

Калі вы слухаеце добрую песню адзін раз — вы радуецеся, атрымліваеце задавальненне. Але, праслухаўшы яе запар дзесяць разоў у адным і тым жа выкананні — вы ўзненавідзеце і песню і выканаўцаў. Тое ж самае адбываецца і ў архітэктуры. Толькі пастаяннае, штодзённае ўдасканаленне, творчае пераасэнсаванне ўносіць элемент чалавечага пачуцця і паэзіі ў архітэктурныя кампазіцыі.

І менавіта таму будаўнічыя канструкцыі, якія з'яўляюцца не толькі шкілетам жылога дома, а яго плоццю, пастаянна павінны ўдасканальвацца і змяняцца не толькі з пункту гледжання статыкі, але і мастацкай формы.

У сувязі з гэтым, напэўна, трэба знайсці іншую форму арганізацыі вытворчасці ў масавым будаўніцтве, якая дазволіла б, выкарыстоўваючы ўсе перавагі індустрыяльнага домабудавання, больш гнутка і з большай колькасцю варыянтаў будаваць жыллё, ствараць прыгожыя дамы і ансамблі, а не «ўзводзіць квадратныя метры».

Напэўна, было б мэтазгодна мець на заводзе групу кваліфікаваных архітэктараў і канструктараў з шырокімі магчымасцямі для правядзення эксперыментаў. Гэта тым больш важна, што цяпер моцна адчуваецца рознасць задач, якія стаяць перад праекціроўшчыкамі, з аднаго боку, і заводамі — з другога. У нас, праекціроўшчыкаў, асноўная мэта — стварыць эканамічныя, выгодныя і прыгожыя дамы, а ў завода — больш вузкая — выдаць пабольш кубаметраў вырабаў. І таму намаганні архітэктараў штосьці змяніць у аблічы жылых раёнаў ні да чаго не прыводзяць.

Трэба зрабіць так, каб завод быў зацікаўлены выпускаць выгодныя, дасканалыя і непадобныя жылыя дамы ў масавым маштабе.

ЛЮБЫ будынак, у тым ліку і жылы дом, акрамя выгоднай і правільнай планіровачнай структуры, акрамя рацыянальнай канструкцыі, павінен быць аздоблены будаўнічымі матэрыяламі. Матэрыялы гэтыя могуць і падоўжыць тэрмін эксплуатацыі будынка, і скараціць, і ўпрыгожыць яго, і, наадварот, — знявечыць. Яны ствараюць неабходныя санітарныя ўмовы або, наадварот,—пазбаўляюць кватэры гэтых умоў.

Адным словам, ад таго, якія матэрыялы будуць выкарыстаны, залежыць і якасць жылога дома. Асабліва гэта важна цяпер, калі будынкі пазбаўлены якога б там ні было дэкору і маюць вельмі простую форму.

Наша прамысловасць выпускае вялікую колькасць будаўнічых матэрыялаў самага рознага прызначэння. Тут і граніт, і мармур, і аздабляльная цэгла, і плітка, і кераміка, шкло, чорныя і каляровыя металы, дрэва і, нарэшце, розная сінтэтыка. Выпускаюцца таксама жалезныя тавары, ацяпляльныя прыборы, ванны, ракавіны і г. д. Адным словам, мноства ўсялякай усячыны, з якой таксама ў канчатковым выніку складваецца архітэктура — прыгожы выгляд, выгоды, камфорт і працяглая эксплуатацыя без капітальнага рамонту. На першы погляд — у руках архітэктара шырокая палітра, карыстаючыся якой можна ствараць прыгожыя і зручныя жылыя дамы. Аднак на практыцы ўсе гэтыя тэарэтычныя магчымасці рэалізаваць вельмі цяжка, часта немагчыма. У Салігорску, напрыклад, дамы на адной з галоўных вуліц было вырашана афактурыць мармуровай крошкай. Такія прыклады ў Мінску ёсць (жылыя дамы па вуліцы Талбухіна і інш.).

Здавалася б, чаго прасцей — прывязі на завод матэрыял і выпускай афактураныя панелі. Але мармуровая крошка раптам аказалася страшным дэфіцытам, і дамы давялося фарбаваць.

Тое ж самае і з матэрыяламі для агароджы балконаў. Да гэтага часу няма добрага эфектыўнага матэрыялу, які можна было б выкарыстаць на экраны. У выніку балконы агароджваюцца азбафанернымі шчытамі, якія афарбоўваюцца, а потым ліняюць. У Салігорску, праўда, знайшлі «выйсце»: балконы дома № 43 у мікрараёне вырашылі наогул не фарбаваць і пакінуць іх у першапачатковым выглядзе. Але, думаецца, што гэта не прыклад для пераймання...

Закладваючы ў праекце той ці іншы матэрыял, архітэктар не заўсёды ўпэўнены, што будаўнікі атрымаюць яго. Таму нярэдкія выпадкі, калі ў працэсе будаўніцтва даводзіцца мяняць матэрыялы з прычыны таго, што іх немагчыма дастаць. Замена звычайна робіцца наспех, без належнага асэнсавання і часта на шкоду будоўлі. Усё гэта вядзе да таго, што архітэктурнае аблічча дома пагаршаецца. Таму неабходна старанна прадумаць, як лепш арганізаваць вытворчасць самых розных матэрыялаў у рэспубліцы. Неабходна мець і граніт, і мармур, і розную сінтэтыку. Сёння нам даводзіцца звяртацца па гэтыя рэчы не толькі ў іншыя рэспублікі, але нават карыстацца паслугамі зарубежных краін.

Заводы, якія выпускаюць аддзелачныя і аздабляльныя матэрыялы, мала клапоцяцца пра іх збыт, і праекціроўшчыкі і будаўнікі не заўсёды добра інфармаваны. Неабходна распрацаваць адзіную сістэму інфармацыі з добрай рэкламай. Замежныя будаўнічыя часопісы, напрыклад, напалову складаюцца з ілюстраванай рэкламы розных будаўнічых фірм. Калі сур'ёзна ўдумацца, дык у гэтым ёсць вялікі сэнс — спецыялісты перыядычна атрымліваюць інфармацыю і заўсёды бываюць у курсе спраў адносна таго, што выпускае прамысловасць.

Але гэта яшчэ не ўсё. Усё яшчэ існуе рад «дырэктыўных» забарон і абмежаванняў на некаторыя матэрыялы. Да іх адносяцца мармур, граніт, каляровы метал і інш. Існуе таксама абмежаванне на тынкоўку. Магчыма, гэта выключае нейкія злоўжыванні, неэканомнае выкарыстанне фондаў і г. д., але гэта ў той жа час звязвае ініцыятыву праекціроўшчыкаў і будаўнікоў, і, каб штонебудзь «прабіць», ім даводзіцца траціць шмат энергіі і часу.

У масавым будаўніцтве, вядома, няма сэнсу выкарыстоўваць дарагія і дэфіцытныя матэрыялы, але таксама нерэнтабельна і немэтазгодна ўжываць матэрыялы, якія патрабуюць хуткага абнаўлення або замены.

У Салігорску, напрыклад, большасць буйнапанельных дамоў знадворку фарбуюць, але ўжо на наступны год яны аблазяць і набываюць неахайны выгляд. У той жа час у многіх гарадах краіны даўно выпускаюць панелі рознай фактуры, з розным аздабленнем. У прыватнасці, вельмі эфектыўнае аздабленне «дывановай» пліткай, дзякуючы чаму ствараецца не толькі трывалая і высакаякасная паверхня панелі, але і з'яўляецца магчымасць рабіць разнастайныя, не падобныя адзін на адзін жылыя дамы. А калі да гэтага дадаць дастатковую колькасць добрых аздабляльных матэрыялаў, такіх, як плітка глазураваная, полівінілхларыд для падлогі і парэнчаў, цікавыя сталярныя вырабы, жалезныя тавары, санітарна-тэхнічныя прыборы і г. д., то мы здолеем зрабіць жылы дом не наборам «квадратных метраў», а эстэтычна прывабным жыллём чалавека.

Салігорцы паспрабавалі пабудаваць адзін жылы дом трошкі вышэйшай якасці за іншыя і дасягнулі пэўнага поспеху. Тут выкарыстаны і матэрыялы, якія ў Салігорску рэдка ўжываюць. Дзякуючы гэтаму дом быў адзначаны на рэспубліканскім конкурсе.

Такія дамы не павінны быць адзінкавымі, мы павінны наладзіць іх масавую вытворчасць.

ТАКІМ ЧЫНАМ, масавае жыллёвае будаўніцтва—гэта не толькі «ўвод квадратных метраў». Архітэктура — мастацтва. Асабліва гэта мы павінны памятаць, будуючы новыя гарады, якія растуць хутчэй, чым мы паспяваем удасканальваць наша мастацтва. Чым хутчэй мы ўсвядомім важнасць не толькі эканамічных фактараў, але і фактараў мастацка-эстэтычных, чым хутчэй наладзім выпуск добрых будаўнічых матэрыялаў і «гнуткіх» будаўнічых канструкцый, тым больш прыгожыя і чалавечныя будуць нашы гарады.

Давайце ж не забываць, што нашы жылыя дамы — гэта не «машына для жылля», а песня, музыка, якая мае сваю арыгінальную, адзіную на ўвесь свет і прыгожую мелодыю, гэта адухоўлены твор мастацтва, створаны чалавекам для чалавека.

ТЭЛЕБАЧАННЕ

1 ліпеня

Першая праграма. 16.45—праграма перадач. 16.50 — для дзяцей. «Светлячок». Мультыплікацыйны фільм (М). 17.00—для школьнікаў. «Першы чэмпіён свету па шахматах». Вядзе перадачу заслужаны майстар спорту К. Зварыкіна. 17.20 — рашэнні XXIII з'езда КПСС — у жыццё. «Шэсць месяцаў пяцігодкі». Расказ пра камсамольска - маладзёжную брыгаду Мінскага гадзіннікавага завода. 17.45 — тэлевізійныя навіны. 18.05 — «У віхры танца». Перадача пра маладзёжны народны ансамбль танца «Радасць». Перадача з Брэста. 19.05 — рашэнні XXIII з'езда КПСС— у жыццё. «Важны рэзерв». Аб праблемах паляпшэння пароднасці жывёлы і птушак. 19.25 — В. Шаўрын. «Абуджанае сумленне». Спектакль Беларускага дзяржаўнага драматычнага тэатра імя Я. Коласа. 22.15—«Фізкультура і спорт». «Два таймы вялікага футбола». Тайм другі (М).

Другая праграма. 17.00 — «Народныя музычныя інструменты». Перадача з Рыгі. 17.20 — «Экран Вялікай хіміі» (М). 18.00 — тэлевізійныя навіны (М). 18.10 — «Здароўе». Навукова-папулярная праграма. 18.40 — Сафокл. «Антыгона». Спектакль Кіеўскага акадэмічнага ўкраінскага драматычнага тэатра імя І. Франка. 20.30 — «Эстафета навін» (М). 21.30 — «Мы крочым па Адэсе». Музычны агляд. Перадача з Адэсы.

2 ліпеня

Першая праграма. 15.15—праграма перадач. 15.20 — Л. Усцінаў і А. Табакоў. «Беласнежка і сем гномаў». Спектакль Беларускага дзяржаўнага драматычнага тэатра імя Я. Коласа. 17.00—лёгкая атлетыка. «Мемарыял братоў Знаменскіх». Перадача з Адэсы. 18.30 — клуб кінападарожнікаў (М). 19.30 — тэлевізійныя навіны (М). 20.00 — «На агеньчык» (М). 21.00 — тэлевізійныя навіны. 21.20—«Звычайны фашызм». Публіцыстычна - дакументальны фільм. Першая і другая серыі.

Другая праграма. 13.55 — для школьнікаў. Л. Малюгін. «Дзяўчынкі-хлопчыкі». Тэлевізійны спектакль (М). 16.00 — тэлевізійныя навіны (М). 16.20 — «Веды». Навукова - пазнавальная праграма (М). 17.00 — кінанарыс «Лёс ваенны». 17.20 — рашэнні XXIII з'езда КПСС — у жыццё. «Універсітэт грамадскага выхавання». Пра работу Палаца культуры Белсаўпрофа. 18.20 — па роднай краіне. «На зямлі туркменскай». Дакументальны фільм. 19.00 — «Чалавек і прырода». «Рэкі цякуць у будучыню». «Паляўнічы з Удэгэ». Кінанарысы. 19.50 — «Станцыйны наглядчык». Харэаграфічная тэлевізійная пастаноўка. 21.00 — тэатральны спектакль (М).

3 ліпеня

Першая праграма. 10.35 — праграма перадач. 10.40 — «Дарогай бацькоў». Фільм Беларускага тэлебачання. 11.00 — «Здароўе». Гімнастыка для жанчын. (М). 11.30 — «Белыя ночы». (З цыкла «Ленінград»). Перадача з Ленінграда. 12.00 — для школьнікаў. «Напад на караля». (Жывая гульня ў шахматы). Перадача з Будапешта. 12.45—для школьнікаў. «Гарніст». Тэлевізійны часопіс. Перадача з Пярмі. 13.45 — «Музычны кіёск» (М). 14.05 — для воінаў Савецкай Арміі і Флоту. «Як табе служыцца?» (М). 14.35 — канцэрт ансамбля Чырванасцяжнага Чарнаморскага флоту. Перадача з Сімферопаля. 15.15 —тэлевізійныя навіны (М). 15.30 — «60 мінут у лабірынце». Тэлевізійна-літаратурная віктарына (М). 16.30 — «Беларуская партызанская». Харэаграфічная кампазіцыя. 17.00 — лёгкая атлетыка. «Мемарыял братоў Знаменскіх». Перадача з Адэсы. 18.30 — першынство СССР па футболу. «Дынама» (Кіеў) — «Пахтакор» (Ташкент). Перадача з Кіева. У перапынку — тэлевізійныя навіны (М). 20.15 — тэлевізійны саюз следапытаў. «Жыццё — подзвіг». (Расказ пра юную разведчыцу Таню Бауэр). 20.45 — кінапанарама (М). 22.00 — «Нядзельная займальная праграма». Перадача з Варшавы. 22.45 — эстрадны канцэрт. (Паўтор ад 14 чэрвеня).

Другая праграма. 18.00 — «Сардэчныя сустрэчы на савецкай зямлі». Дакументальны фільм. 19.00—Д. К'юсак. «Гарачае лета ў Берліне». Спектакль Беларускага дзяржаўнага драматычнага тэатра імя Я. Коласа.

Галоўны рэдактар Н. Е. ПАШКЕВІЧ.

Рэдакцыйная калегія: З. І. АЗГУР, Г. М. БУРАЎКІН, А. І. БУТАКОЎ, К. Л. ГУБАРЭВІЧ, Т. А. ДУБКОВА, Г. М. ЗАГАРОДНІ, В. Ул. ІВАШЫН, А. М. КАШКУРЭВІЧ, В. Б. ЛАДЫГІНА, П. М. МАКАЛЬ, А. Н. МАРЦІНОВІЧ, Р. К. САБАЛЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), І. А. САНКОВА, З. Ф. СТОМА, М. Г. ТКАЧОЎ, Р. Р. ШЫРМА.

«Літаратура і мастацтва» выходзіць у аўторак і пятніцу.

НАШ АДРАС І ТЭЛЕФОНЫ: г. Мінск, вул. Захарава, 19. Тэлефоны: прыёмнай рэдакцыі — 3-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 3-25-25, адказнага сакратара — 3-44-04, аддзела літаратуры — 3-21-53 аддзела тэатра кіно і музыкі — 3-24-62, аддзела выяўленчага мастацтва, архітэктуры і вытворчай эстэтыкі — 3-24-62, аддзела публіцыстыкі — 3-22-04, аддзела культуры — 3-22-04, аддзела інфармацыі — 3-44-04, карэспандэнцкага пункта ў Гомелі — 2-70-83, выдавецтва— 6-25-19, бухгалтэрыі — 6-97-44.

«Литература и искусство»—орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР. Минск.

Друкарня выдавецтва «Звязда».
Індэкс 63856. АТ 01699